

ПОШТА, КАМФОРТНАЯ ДЛЯ КЛІЕНТАЎ

5

МОЦ НАЦЫЯНАЛЬНАГА ДУХУ

МС





Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

21 ВЕРАСНЯ 2022 г.
СЕРАДА
№ 185 (29807)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ


## КОРАТКА

- Беларускія палярнікі адправяцца ў 15-ю антарктычную экспедыцыю напрыканцы кастрычніка.
- Рэканструкцыю пункта пропуску «Варшаўскі мост» завершаць да канца года.
- Беларускі фонд міру адкрыў дзве палаты для ветэранаў ва Уздзенскай раённай бальніцы.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксей ГАЙДАШОЎ, начальнік Рэспубліканскага цэнтра палярных даследаванняў Нацыянальнай акадэміі навук:**

*«Кожны год аб'ём навуковых даследаванняў, якія праводзяцца беларусамі ў Антарктыцы, павялічваецца. Калі раней у палярнікаў было да пяці-шасці навуковых заданняў, то зараз гэта восем асноўных і некалькі факультатыўных. Цешыць і тое, што кожны год прырастае колькасць навуковых арганізацый, якія выказваюць жаданне без дадатковых фінансавых сродкаў удзельнічаць у розных даследаваннях у Антарктыцы. У першую чаргу тон задаюць інстытуты НАН. Кожны прапануе сваю факультатыўную праграму па розных напрамках. Сярод іх вывучэнне фізіялогіі, псіхалогіі, выпрабаванні сучасных матэрыялаў, прыбораў і шмат што іншае. Палярнікі рэалізоўваюць гэтыя праграмы, прывозяць свае справаздачы і рэкамендацыі. Такім чынам, многія адкрыцці і даследаванні атрымліваюць далейшую рэалізацыю ў практычнай дзейнасці».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «СІТУАЦЫЯ ВЕЛЬМІ СУР'ЁЗНАЯ, Я НАВАТ СКАЗАЎ БЫ НЕБЯСПЕЧНАЯ, І НАМ НІ Ў ЯКІМ РАЗЕ НЕЛЬГА СПРАШЧАЦЦА»

## Прэзідэнт запатрабаваў падрыхтаваць «абсалютна адкрытую» Канцэпцыю нацыянальнай бяспекі

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам Дзяржаўнага сакратара Савета Бяспекі Аляксандра Вальфовіча. На парадку дня — абноўленая Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі.**



Фота БелТА.

У ёй прапаноўваецца ўлічыць навелы, замацаваныя ў абноўленай Канстытуцыі. Адна з асноўных звязана з захаваннем гістарычнай памяці. Канстытуцыйная катэгорыя «народ» і яго ўсямерная абарона ўключаны ў пералік стратэгічных нацыянальных інтарэсаў. Таксама абазначаны новыя нацыянальныя інтарэсы: сацыяльная адказнасць грамадзян (а не толькі дзяржавы), бяспека персанальных даных, развіццё атамнай энергетыкі. З улікам сусветных пагроз біялагічнага характару ў Канцэпцыю дабаўлена новая сфера — біялагічная бяспека. У цэлым Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі абнавілася амаль на 70 працэнтаў. Гэта звязана, у першую чаргу, з нарастаннем геапалітычнай нестабільнасці.

«Сітуацыя мяняецца, вы гэта лепш за мяне разумееце і ведаеце, былі прыцягнуты да падрыхтоўкі ранейшых канцэпцый. На якім узроўні мы сёння знаходзімся пры падрыхтоўцы новай Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі?» — пацікавіўся Прэзідэнт. Пры гэтым ён папрасіў, каб Канцэпцыя была абсалютна адкрытая. Аляксандр Лукашэнка зрабіў акцэнт на тым, што не трэба нічога хаваць, зыходзячы з нейкіх палітычных ці эканамічных матываў.

СТАР. 2

# Менавіта адзінства дазваляе пераадольваць выклікі, захоўваць і развіваць уласную дзяржаўнасць



### З выступлення Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Н. І. Качанавай на адкрыцці дзясятай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання

Мы з'яўляемся відавочцамі няпростых трансфармацый у гісторыі чалавецтва — змяняецца геапалітычная эпоха. Аднапалярны светапарадак перажывае сваё змярканне, і фарміруецца шматпалярная сістэма каардынат. За тое, хто будзе на чале новай іерархіі, разгортваецца жорсткая і напружаная барацьба.

Аднак калі ўважліва зазірнуць у мінулае, тое становіцца відавочным: усё гэта ўжо было, і неаднойчы. Як і раней, нашы тэрыторыі знаходзяцца на самым вастрыі геапалітычных трансфармацый. З веданнем гісторыі прыходзіць і разуменне каштоўнасці народнага адзінства як сістэмаўтваральнага кода беларускай нацыі, нашай унутранай сілы, нашага нацыянальнага стрыжня.

СТАР. 4

# Забяспечыць непахіснасць канстытуцыйнага ладу, пераемнасць пакаленняў і грамадзянскую згоду



### З выступлення Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь У. П. Андрэйчанкі на адкрыцці дзявятай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання

Напярэдадні краіна адсвяткавала новае, але якое ўжо трывала ўвайшло ў нацыянальную свядомасць, свята — Дзень народнага адзінства. Гэта даніна ўдзячнасці нашым продкам, якія дапамаглі захаваць Беларусь на адным з самых трагічных этапаў яе гісторыі.

Тое, з якім эмацыянальным уздымам было ўспрынята выступленне Кіраўніка дзяржавы на патрыятычным форуме «Гэта НАША гісторыя!», лепш за ўсялякія словы сведчыць аб узрослай грамадзянскай сталасці нашага грамадства і непераходзячым значэнні тых каштоўнасцяў, вакол якіх яно згуртавалася ў гэты няпросты час.

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

22185

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

СА «ЗВЯЗДОЙ» ЦЯПЛЕЙ І ЎТУЛЬНЕЙ!

Ідзе падпіска на IV квартал 2022 года.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ ВОСЕННЮ І ЗІМОЙ. БУДЗЕ ЦІКАВА!

# «СІТУАЦЫЯ ВЕЛЬМІ СУР'ЁЗНАЯ, Я НАВАТ СКАЗАЎ БЫ НЕБЯСПЕЧНАЯ, І НАМ НІ Ў ЯКІМ РАЗЕ НЕЛЬГА СПРАШЧАЦЦА»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Мы павінны сапраўды прапісаць тыя рызыкі і пагрозы, якія існуюць, і нашу рэакцыю на іх. Каб і суседзі, і іншыя ведалі, як мы на іх будзем рэагаваць. Каб не казалі, што для некага гэта была нечаканасць. Не трэба нічога хаваць, трэба ўсё рабіць сумленна. Калі мы з Расіяй, значыць, мы з Расіяй. Мы стварылі абаронную прастору, у нас агульныя Узброеныя Сілы фактычна, наша армія на вастры. Рэгіянальная групоўка дзейнічае. І няхай ніхто нас не крытыкуе і не робіць з гэтага нейкіх фэйкаў ці надзвычайных заяў. Што «ах, вох, вось Лукашэнка, расійскія войскі і іншае». А што тут дзіўнага? Мы даўно аб гэтым заявілі. Ужо, мусіць, гадоў 20, як мы дамовіліся аб гэтым. Тут няма нічога дзіўнага. Ім патрэбны гэтыя надзвычайныя здарэнні, таму яны і будуць пісаць», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт падкрэсліў, што ў абноўленай Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі трэба ўсё прапісаць, каб у грамадстве ведалі, як будзем абараняцца і якія будуць нашы дзеянні.

## «Нам трэба абараніць сваю Айчыну»

У сувязі з гэтым кіраўнік дзяржавы паставіў перад Аляксандрам Вальфовічам яшчэ адно пытанне — сітуацыя на паўднёвай граніцы. Ён нагадаў, што яшчэ на пачатку спецыяльнай ваеннай аперацыі Расіі ва Украіне даручыў сілавым структурам прапрацаваць на практыцы дзеянні на граніцы з Украінай. Там ёсць вопыт супрацьдзеяння, у тым ліку стварэння батальённых тактычных груп прыкрыцця граніцы. «Зноў жа, не трэба нас папракаць, што мы ва Украіне збіраемся ваяваць і іншае. Нам трэба абараніць сваю Айчыну. І што датычыцца падтрымкі Расіі — яшчэ раз пацвярджаю: праз Беларусь ніякага ўдару ў спіну, у бок, збоку з флангаў па расійскіх войсках быць не павінна і не будзе. У гэтым нашы абавязацельствы перад нашым саюзнікам», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Савет Бяспекі па даручэнні Прэзідэнта аналізуе сітуацыю ў сілавых структурах, каардынуе пэўныя мерапрыемствы і інфармуе Прэзідэнта. «Усе станоўчыя рысы гэтых мерапрыемстваў я ведаю. Я быў ваенным шмат гадоў, таму ведаю, як гэта ўмеюць падаваць: схаваць нешта негатыўнае, лепшае паказаць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён заўважыў, што добрага было шмат. Але кіраўнік дзяржавы пацікавіўся, што выявілася негатыўнага і над чым яшчэ трэба працаваць.

«Сітуацыя вельмі сур'ёзная, я нават сказаў бы небяспечная, і нам ні ў якім разе нельга спрашчацца. Не трэба нічога баяцца. Трэба падняць па трывозе воінскую часць па нормах ваеннага часу — значыць, трэба. Трэба адмабілізаваць яе, каб мы бачылі, ці жывыя людзі, якія прыпісаны да гэтай часці, — значыць, трэба яе адмабілізаваць. Трэба тэрытарыяльную абарону падняць — значыць, трэба. Трэба народнае апалчэнне праверыць на месцы, што гэта за байцы ў нас будуць і якая ў іх зброя — значыць, трэба. Асабліва апошняе, таму што народнае апалчэнне ў нас у стадыі фарміравання. Таму пра гэтыя рэчы мы не павінны забывацца і гэта ўсё павінна быць пад кантролем», — заявіў Прэзідэнт.

## «Нам не патрэбны фэйкі»

Кіраўнік дзяржавы таксама закрануў пытанне інфармацыйнай бяспекі. Яго ён назваў пытаннем пытанняў. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што цяпер ідзе вайна, перш за ўсё, у сферы інфармацыйнай бяспекі. І тут павінны быць падключаны ўсе: ад журналістаў да Прэзідэнта.

«Інфармацыйная вайна — гэта вельмі небяспечна ў сучасным свеце. Пачынаючы ад газеты раённай і прыватнай і заканчваючы інтэрнэтам. Усюды павінны актыўна працаваць», — сказаў Прэзідэнт. Ён пагадзіўся з прапановай, што дзяржсакратарыят Савета Бяспекі павінен быць да гэтага падключаны. «Гэта будзе добрая апора для нашых дзеянняў у СМІ. Але хачу вас перасцерагчы ад усялякіх фэйкаў, нам гэтым шляхам ісці не трэба. Не трэба нам фэйкі, нам трэба паказваць сапраўдную рэчаіснасць. У рэшце рэшт гэта перамагае. Фэйк — гэта на дзень, на два, а потым усё развееццa. Таму не трэба фэйкі, не трэба даваць ілжывую інфармацыю, трэба рабіць усё дастойна, прыгожа, каб потым не апраўдвацца», — акцэнтаваў Прэзідэнт.

## «Нам спакойна жыць не дадуць»

Наступным пытаннем стала ўзмацненне работы з рэспубліканскімі органамі ўлады. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што трэба ўзмацняць адказнасць, дысцыпліну нашага грамадства. Па яго словах, непарадкаў звышдастаткова. Нават займаючыся дробяззю, можна выйсці на вельмі сур'ёзныя пытанні. Прэзідэнт прывёў прыклад. У адной з прыватных школ хлопчык выстраліў з пісталета. Гэта быў дзіцячы пісталет з гумавымі шарыкамі, але яны змаглі разбіць дзяўчынцы акуляры і пашкодзіць вока.

«З гэтага зрабілі надзвычайшчыну. Я даручыў разабрацца. Справа нават не ў гэтай дробязі, хоць гэта таксама важна. Аказваецца, у гэтай школе ажно 26 вучняў. Што гэта за школа — ажно 26 вучняў. Пачалі разбірацца — яна зарэгістраваная на тэрыторыі нейкага прыватнага прадпрыемства, якое ні халеры не робіць. Напэўна, чакаюць, каб гэтую зямлю прыкарманіць і пабудаваць там жыллё (а месца зручнае), потым прадаць можна добра. Пачалі разбірацца, а кіраўніцтва школы на дух не ўспрымае беларускую дзяржаву. Там каламуць нейкая, клаака антыдзяржаўная ўтварылася», — расказаў Аляксандр Лукашэнка. Таму ён даручыў неадкладна ўвесці ліцэнзаванне падобных устаноў. Па словах кіраўніка дзяржавы, трэба навесці парадак у сістэме адукацыі.

«Народная адукацыя школы ВНУ — не тая сфера, дзе мы павінны жартаваць, — заўважыў ён. — Здавалася б, нехта ляпнуў у інтэрнэце, пачалі раскручваць, выйшлі на цікавыя моманты. Пра што гэта гаворыць? Што мы пачынаем пакрысе супакойвацца. Усё ў нас добра пасля 2020 года».

Прэзідэнт падкрэсліў, што супакойвацца нельга. Па яго словах, мы ў гэтым катле, нам спакойна жыць не дадуць, нас увесь час будуць ціснуць па ўсіх кірунках. «А гэтыя «свядомыя», гэта ўжо ворагі, яны ўвесь час будуць круціць, каламуціць і падкідваць нам розныя пытанні. Потым у патрэбны момант зноў пойдуць граніць, бамбіць, здзеквацца з людзей. Бракуе дысцыпліны», — канстатаваў ён. Кіраўнік дзяржавы даручыў дзяржсакратарыяту і ўсім, хто адказны за выканаўчую дысцыпліну, мабілізаваць усе структуры органаў улады на навядзенне дысцыпліны і парадку ў краіне па ўсіх напрамках.

«У нас хапае праблем і ў сацыяльнай сферы, і ў эканоміцы. Усё больш атрымліваю інфармацыі, што тыя збеглыя і іх сваякі тут заляглі ціхенька, адляжаліся і сёння разгортваюць бізнесы. І прама кажуць, што «мы зараз грошай падназапасім, а потым тут зладзім бучу». А ва Украіне ўжо ствараюцца нейкія ці то палкі, ці то батальёны для звяржэння не толькі ўлады, але і для таго, каб перавярнуць, адарваць Беларусь і далучыць да блока НАТА. Хочуць новую Украіну ў Беларусі стварыць! Гэта недапушчальна. Я пра гэта кажу адкрыта і шчыра, каб ведалі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

### ❍ У тэму

### ГАРАНТАВАЦЬ БЯСПЕКУ НАШЫХ ГРАМАДЗЯН

**Дзяржаўны сакратар Савета Бяспекі Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ** расказаў журналістам, пра што ішла размова на сустрэчы з Прэзідэнтам. Кіраўніку дзяржавы былі далажаны асноўныя напрамкі ўдасканалення ваеннай арганізацыі дзяржавы з улікам сучасных рызык, выклікаў і пагроз. «Абстаноўка сёння сапраўды вельмі няпростая. І сілавы блок павінен зрабіць усё для таго, каб наш народ, краіна жылі мірна і спакойна. Гарантаваць бяспеку нашых грамадзян — асноўная задача, якая стаіць перад структурамі сістэмы нацыянальнай бяспекі. Нацэлена была ўвага на тое, што гэтыя сістэмы павінны быць гатовы супрацьдзеянню любым выклікам і пагрозам, рэагаванне на любыя надзвычайныя сітуацыі, як на граніцы, так і ўнутры краіны, на дакладнае ўзаемадзеянне ўсіх структур сілавога блока па нейтралізацыі гэтых пагроз», — адзначыў дзяржсакратар.

Аляксандр Вальфовіч расказаў, што абноўленая Канцэпцыя дзяржаўнай бяспекі ўжо практычна гатовая. Работа над ёй вялася на працягу года. «Гэта асноўны дакумент, які выпрацоўвае механізм процідзеяння сучасным выклікам і пагрозам. Зыходзячы са стратэгічнай канцэпцыі блока НАТА, якая выйшла ў мінулым годзе, ва Усходнім еўрапейскім рэгіёне ідзе ўзмацненне ваеннай актыўнасці, нарошчванне ваенных груповак у тым ліку на межах Рэспублікі Беларусь, павялічваецца колькасць вучэнняў, колькасць ваеннаслужачых Аб'яднаных узброеных сіл НАТА. Вось гэтая ваенная актыўнасць і гэтая ваенная прысутнасць, вядома ж, не могуць не хваляваць і не выклікаць турботы і не пагражаць бяспецы Рэспублікі Беларусь. Таму наша Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі выпрацоўвае асноўныя механізмы супрацьдзеяння гэтым выклікам і пагрозам. Намі дасканала вывучаны досвед іншых краін па распрацоўцы стратэгічных дакументаў у сферы нацыянальнай бяспекі. Гэта не значыць, што мы скапіравалі. Мы заклалі тыя пасылы, якія адлюстраваны сёння ў Канстытуцыі», — расказаў ён. Дакумент гатовы да абмеркавання на Савеце Бяспекі. І, калі ён будзе адобраны, Прэзідэнт даручыў прадумаць пытанне аб абмеркаванні яго на пляцоўках па прынцыпе Канстытуцыі. Па словах Аляксандра Вальфовіча, гэта забяспечыць удзел грамадзян у кіраванні краінай і пакажа, што дакумент адкрыты.

# «НА ВАС УСКЛАДЗЕНА САМАЯ АСНОЎНАЯ ФУНКЦЫЯ НА ПЯРЭДНІМ РУБЯЖЫ»

**Прэзідэнт прыняў з дакладам Старшыню Дзяржаўнага мытнага камітэта Уладзіміра Арлоўскага. У цэнтры ўвагі — пытанні функцыянавання мытных органаў: ад выканання задачы па напаўненні бюджэту да супрацьдзеяння санкцыйнаму ціску Захаду.**

«З вашага пункту гледжання, якая сітуацыя на граніцы? Натуральна, з пункту гледжання эканомікі перш за ўсё. Як вы выконваеце асноўныя свае абавязкі па фарміраванні дзяржаўнага бюджэту ў той сферы, за якую адказныя?» — пацікавіўся кіраўнік дзяржавы. Ён нагадаў, што нядаўна адбылося пераразмеркаванне функцый і паўнамоцтваў паміж дзяржаўнымі пагранічным і мытным камітэтамі. У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка спытаў, як ідуць справы.

«Я хацеў бы, каб вы далі ацэнку нашым дзеянням, як дзейнічаеце па напрамку супрацьдзеяння санкцыйным мерам з боку Захаду. Захад увёў супраць нас санкцыі. Мы адказалі. На вас ускладзена самая асноўная функцыя на пярэднім рубяжы, у эканоміцы — па кантролі за выкананнем мерапрыемстваў антысанкцыйнага характару, гэта значыць, нашы меры ў адказ. Як яны сёння ў нас выглядаюць? Што адбываецца ў сувязі з гэтым?» — паставіў пытанні Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы асобна звярнуў увагу на ўдасканаленне інфраструктуры на пунктах мытнага пропуску і мытных тэхналогій. «Еўрапейскі саюз калісьці фінансаваў некаторыя сумесныя праграмы ў сферы мытні на нашай граніцы. У свой час яны перасталі нам дапамагаць, нас падтрымліваць у гэтым плане, адмовіліся ад выканання праграм. Гэта свінства поўнае: паабяцалі, дамовіліся, а потым на гэта ўсё плюнулі. Што ж, яны, відаць, маюць на гэта права». «Мы змаглі замясціць іх адсутнасць сваімі мерамі? Мы не страцілі гэтыя праграмы, працягваем удасканальваць інфраструктуру мытных органаў?» — спытаў ён.

Сустрэча Прэзідэнта са старшынёй Дзяржаўнага мытнага камітэта прайшла ў прафесійнае свята мытнікаў. Прэзідэнт павіншаваў усіх, хто працуе на мытні. «Перадайце ім самыя добрыя пажаданні ад майго імя. Яны выконваюць вельмі важныя функцыі. Дай бог, каб гэта заўсёды было дастойна, не так, як у першыя гады майго прэзідэнцтва», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Уладзімір Арлоўскі падзякаваў за віншаванне і далажыў аб сітуацыі на граніцы.

«Вядома, з-за беспрэцэдэнтных санкцый Еўрасаюза наша работа моцна змянілася. Тое, што забаранілі ўезд нашым грузавікам, і беларускім, і расійскім, наклала сур'ёзны адбітак на нашу працу. Але мы на працягу тыдня арганізаваліся, у нас для гэтага ўжо былі лагістычныя цэнтры ўздоўж граніцы. Мы дадалі, абсталявалі яшчэ шэраг пляцовак, перавялі асабовы склад у кругласутачны рэжым і работу па перачэпцы, перагрузцы наладзілі літаральна за тыдзень», — сказаў ён.

«Гэта значыць, заехала фура — адчапляй або перагружай тавар і выязджай у Еўрасаюз, далей працуем мы і расіяне?» — удакладніў Аляксандр Лукашэнка. «Абсалютна дакладна. Задзейнічаем нашых перавозчыкаў. І ў адваротны бок дакладна гэтаксама», — пацвердзіў Уладзімір Арлоўскі.

### ❍ У тэму

Журналістам **Уладзімір АРЛОЎСКІ** расказаў, як зараз працуе Дзяржаўны мытны камітэт. Ён нагадаў, што ў Беларусі ўстаноўлена забарона на перамяшчэнне па яе тэрыторыі грузавых аўтамабіляў краін Еўрасаюза (гэта мера прынята ў адказ на ўвядзенне з боку ЕС санкцый у дачыненні да беларускіх і расійскіх транспартных кампаній). Для перамяшчэння тавараў у недружалюбныя краіны або з іх магчыма перачэпка або перагрузка грузаў у 18 спецыяльна ўстаноўленых месцах, дзе могуць адначасова знаходзіцца амаль 2,2 тысячы грузавых аўтамабіляў. Штосутачна праходзіць каля адной тысячы перачэпак і 400 перагрузак.

Паводле інфармацыі ДМК, за 2022 год у рэспубліканскі бюджэт паступіла Br5,8 мільярда мытных плацяжоў. Праз мытную граніцу ЕАЭС у Беларусь праехала больш за 951 тысячу грузавых аўтатранспартных сродкаў, аб'ём перамешчаных тавараў склаў 12 мільёнаў тон. Больш як у тры разы павялічылася колькасць перамяшчэння легкавога транспарту — з 321 тысячы адзінак да 1,2 млн адзінак. Сёлета плануецца завяршыць рэканструкцыю сямі аўтадарожных пунктаў пропуску: «Брэст», «Макраны», «Беняконі», «Катлоўка», «Відзы», «Грыгараўшчына» і «Новая Рудня».

«Мы ствараем камфортныя ўмовы для асоб, якія перасякаюць граніцы: будуем навесы, паляпшаем размяшчэнне ў месцах чакання. Усё, што мы намецілі на гэты год, нягледзячы на санкцыі, выканаем», — канстатаваў Уладзімір Арлоўскі.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Парламенцкі дзённік

# ГАРАНТЫІ І КАМПЕНСАЦЫІ ДОНАРАМ, ЗМЕНЫ Ў ПРАЦОЎНЫ КОДЭКС

## Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў прынялі 11 законапраектаў

**Учора на пасяджэнні Палаты прадстаўнікоў было разгледжана 11 законапраектаў. Сярод іх шэраг тых, што закрануць кожнага з нас. У прыватнасці, праект Закона «Аб змяненні законаў па пытаннях працоўных адносін», які прадугледжвае папраўкі ў Працоўны кодэкс. Законапраект «Аб змяненні законаў па пытаннях аховы здароўя, донарства крыві і яе кампанентаў» замацуе правы і абавязкі донараў, ільготы, гарантыі і кампенсацыі ім. Праект Закона «Аб змене законаў па пытаннях аказання жыллёва-камунальных паслуг» прапануе даваць права мясцовым выканаўчым і распарадчым органам вызначаць выканаўцаў па аказанні на дагаворнай аснове жыллёва-камунальных паслуг, не праводзячы працэдуру закупак.**

У другім чытанні дэпутаты прынялі законапраект «Аб змяненні законаў па пытаннях аховы здароўя, донарства крыві і яе кампанентаў». Ён прапануе замацаваць правы і абавязкі донараў, а таксама льготы, гарантыі і кампенсацыі, якія даюцца ім. У прыватнасці, донару гарантуюцца вызваленне ад работы і ваеннай службы, адукацыйнага працэсу ў дзень здачы крыві, яе кампанентаў, захаванне сярэдняга заработку (грашовага забеспячэння) за дзень здачы і атрыманне бясплатнага харчавання або яго кампенсацыі, пакрыццё расходаў, звязаных з выкананнем донарскай функцыі, назначэнне дапамогі па часовай непрацаздольнасці з першага дня страты працаздольнасці ў памеры 100 працэнтаў сярэднядзённага заработку, узнагароджанне нагрудным знакам «Ганаровы донар Рэспублікі Беларусь».

У сваю чаргу донару, узнагароджанаму такім нагрудным знакам, даецца зніжка ў памеры 25 % на платныя медыцынскія паслугі ў дзяржаўных арганізацыях аховы здароўя, за выключэннем платных медыцынскіх паслуг, тарыфы на якія рэгулююцца Міністэрствам аховы здароўя, кароткачасовы адпачынак без захавання заработнай платы працягласцю да 14 каляндарных дзён, павышэнне пенсіі па дасягненні агульнаўстаноўленага пенсіённага ўзросту ў адпаведнасці з заканадаўствам аб пенсіённым забеспячэнні.

У першым чытанні дэпутаты прынялі законапраект «Аб змяненні законаў па пытаннях аказання жыллёва-камунальных паслуг». Ён прапануе даць права мясцовым выканаўчым і распарадчым органам да 1 ліпеня 2024 года вызначаць выканаўцаў для аказання на дагаворнай аснове жыллёва-камунальных паслуг з ліку арганізацый, маёмасць якіх знаходзіцца ў камунальнай уласнасці, і акцыянерных таварыстваў, акцыі якіх належаць адміністрацыйна-тэрытарыяльным адзінкам.

Як адзначыў **міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Андрэй ХМЕЛЬ**, на працягу шэрагу гадоў прыярытэтнай задачай у сферы ЖКГ у краіне з'яўляецца бесперабойнае функцыянаванне інфраструктуры, аказанне якасных жыллёва-камунальных паслуг і выкананне работ па аб'ектах знешняга добраўпарадкавання населеных пунктаў. Усё гэта ажыццяўляецца сёння, як правіла, арганізацыямі камунальнай формы ўласнасці, што ўваходзяць у сістэму ЖКГ.

— Часта менавіта па якасці выканання і аператыўнасці работ ЖКГ грамадзяне даюць ацэнку эфектыўнасці работы ўлады на месцах, — расказала **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве Палаты прадстаўнікоў Аксана ГАЙДУК.** — Раней з улікам дзеючага заканадаўства для таго, каб выбраць выканаўцу паслуг ЖКГ, а таксама на работах знешняга добраўпарадкавання неабходна было правесці працэдуру закупак. Гэта патрабавала пэўнага часу. Часта былі нараканні ад грамадзян, таму што неаператыўна вырашаліся іх звароты ў сістэме ЖКГ. Цяпер даецца права выканаўчым і распарадчым органам на месцах сваімі рашэннямі прызначаць выканаўцаў ЖКП. Гэта значыць, працэдуры закупкі ўжо неабавязковыя. Але не выключаецца права на іх правядзенне ў выпадку неабходнасці, — патлумачыла дэпутат.

Навацыі законапраекта накіраваны на забеспячэнне якаснага і аператыўнага выканання работ, бесперабойнага цеплазабеспячэння спажыўцоў, бяспечнай эксплуатацыі індывідуальных цеплавых крыніц і аператыўнага рэагавання ў выпадку аварыйных сітуацый.

У другім чытанні дэпутаты прынялі законапраект «Аб рэгуляванні бяспекі пры выкарыстанні атамнай энергіі», накіраваны на ўмацаванне і падтрыманне належнага ўзроўню ядзернай і радыяцыйнай бяспекі пры выкарыстанні атамнай энергіі. Таксама парламентарыі прынялі законапраекты «Аб змене Падатковага кодэкса Рэспублікі Беларусь», «Аб змене законаў па пытаннях бухгалтарскага ўліку і справаздачнасці», «Аб змене Закона Рэспублікі Беларусь «Аб асновах дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі», «Аб змене законаў па пытаннях апрацоўкі персанальных даных».

Законапраект «Аб змяненні законаў па пытаннях працоўных адносін» прадугледжвае пашырэнне сацыяльна-працоўных гарантый работнікам, карэкціроўку нормаў па пытаннях рабочага часу, атрымання працоўных і сацыяльных водпускаў, выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій у працоўных адносінах. Падрабязнасці аб змяненнях у Працоўны кодэкс чытайце ў наступным нумары газеты.

**Алена КРАВЕЦ.**

Акцэнты

# «НАЙВЫШЭЙШЫ ЎЗРОВЕНЬ СУПРАЦОЎНІЦТВА»

## Стратэгічная сутнасць беларуска-кітайскай дэкларацыі

**Першы віцэ-прэм'ер Беларусі Мікалай СНАПКОЎ расказаў, у чым сутнасць і асноўнае напаўненне падпісанай у Самаркандзе па выніках сустрэчы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі і Старшыні КНР Сі Цзіньпіна Сумеснай дэкларацыі аб устанаўленні адносін усепагоднага і ўсебаковага стратэгічнага партнёрства, перадае БелТА.**

«Яшчэ з 1996 года, зыходзячы з блізкасці дыпламатычных адносін з краінамі, Кітай пачаў класіфікаваць свае адносіны. Усяго на гэты момант выдзяляецца 11 асноўных крытэрыяў. Унутры свае падвіды. У выніку 24 узроўні. Прынятая ў Самаркандзе дэкларацыя — гэта найвышэйшы ўзровень супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі — Кітаем і Беларуссю. Усепагоднае і ўсебаковае стратэгічнае партнёрства. Што гэта значыць? Незалежна, у які момант, як і дзе змяняецца міжнародная сітуацыя, абедзве краіны падтрымліваюць цесныя адносіны ў палітычным, эканамічным пытаннях, у сферы бяспекі», — заўважыў першы віцэ-прэм'ер.

Паводле яго слоў, узровень адносін для КНР — гэта ступень даверу да той ці іншай краіны. «Асабліва гэта важна цяпер — у сітуацыі глабальных змяненняў у свеце, палітычных гульняў, эканамічных санкцый. Скажы мне, хто твой сябар, і я скажу, хто ты. Для Беларусі такі ўсепагодны партнёр — аснова незалежнага развіцця», — падкрэсліў Мікалай Снапкоў.

Дэкларацыя мае не толькі агульнапалітычны і фундаментальны, але і канкрэтны прыкладны характар. Прыярытэтнымі задачамі на найбліжэйшую перспектыву супрацоўніцтва вызначаны паскарэнне тэхналагічнай і інвестыцыйнай кааперацыі, міжрэгіянальнае ўзаемадзеянне са стварэннем тэрыторый паглыбленага супрацоўніцтва, у прыватнасці, з гарадамі Цяньцзінь, Чунцын і Цындаа.

Да прыярытэтных задач у адпаведнасці з дэкларацыяй аднесены гандлёвае, фінансавае і міжбанкаўскае супрацоўніцтва. У дэкларацыі таксама вызначаны паглыбленыя напрамкі. Гэта супрацоўніцтва ў галіне харчовай бяспекі, «зялёнай» эканомікі, традыцыйнай кітайскай медыцыны, фармацэўтыкі і біятэхналогій. «У Кітайска-беларускім індустрыяльным парку «Вялікі камень» будзе створаны рэгіянальны цэнтр традыцыйнай і інавацыйнай кітайскай медыцыны. І гэта таксама замацавана ў тэксце дэкларацыі», — адзначыў Мікалай Снапкоў.

У якасці ключавога напрамку вызначана вельмі важнае для Беларусі ў бягучым санкцыйным перыядзе супрацоўніцтва ў транспартна-лагістычнай сферы, уключаючы павелічэнне кантэйнерных перавозак, стварэнне «зялёных» чыгуначных калідораў, развіццё трансгранічнай аўтамабільнай лагістыкі.

«Прыняцце сумеснай дэкларацыі дасць новы імпульс дзяржорганам Кітая і бізнесу па інтэнсіфікацыі ўсяго комплексу гандлёва-эканамічнага і інвестыцыйнага супрацоўніцтва паміж Кітаем і Беларуссю, створыць спрыяльныя ўмовы для рэалізацыі сумесных праектаў сацыяльна-эканамічнага і гуманітарнага развіцця дзвюх краін», — падкрэсліў Мікалай Снапкоў.

Як вядома, Аляксандр Лукашэнка і Сі Цзіньпін сустрэліся ў Самаркандзе, дзе 15—16 верасня прымалі ўдзел у саміце Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. «Сустрэча старых сяброў заўсёды цёплая. За 30 гадоў дыпламатычных адносін Кітая і Беларусі нашы двухбаковыя адносіны бесперапынна мацуюцца. Сумесна са спадаром Прэзідэнтам дасягнутыя дамоўленасці эфектыўна рэалізоўваюцца, усебаковае супрацоўніцтва дзвюх краін вызначаецца трываласцю і ўстойлівасцю. Па выніках сустрэчы мы прымаем сумесную дэкларацыю аб устанаўленні адносін усепагоднага і ўсебаковага стратэгічнага партнёрства, ажыццяўляючы гістарычны ўздым нашага супрацоўніцтва на новы ўзровень», — заявіў Сі Цзіньпін. Ён запэўніў, што гатовы і надалей сумесна з беларускім лідарам прыкладаць намаганні для рэалізацыі ўзаемнай палітычнай падтрымкі, актывізацыі ўсяго комплексу кітайска-беларускага супрацоўніцтва на карысць народаў дзвюх краін. Старшыня КНР таксама падзякаваў за асаблівую ўвагу да кітайска-беларускіх адносін.

У сваю чаргу Аляксандр Лукашэнка запэўніў Старшыню КНР Сі Цзіньпіна ў надзейнасці беларускай дружбы. «Дарагі Старшыня, дзякую вам за тыя добрыя словы, якія вы толькі што сказалі. Калі хочаце ведаць наша стаўленне да Кітайскай Народнай Рэспублікі і вас асабіста цяпер, памножце тое, што вы сказалі, на два. Вы заўсёды для нас былі не проста моцным, надзейным сябрам, але і сур'ёзнай апорай у гэты няпросты час. Які час, вы не горш за мяне ведаеце, — заявіў Прэзідэнт. — Яшчэ раз хачу пацвердзіць нашу накіраванасць на паглыбленне адносін. Мы заўсёды падтрымлівалі Кітай ва ўсіх прынцыповых пытаннях, такіх як эканамічны рост, адзінства, цэласнасць Кітая, палітыка «аднаго Кітая». Па ўсіх пытаннях мы заўсёды былі побач, і нават калі нехта хацеў бы нас у нечым папракнуць, не знайшоў бы такой прычыны. Так будзе заўсёды. Мы надзейныя сябры. Чаго б нам ні каштавала, калі мы паабяцалі, мы гэтай палітыкі і практыкі будзем прытрымлівацца».

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### ЗША прызналі факт вывазу патагенных штамаў і біяматэрыялаў украінскіх грамадзян



Злучаныя Штаты падчас нарады ў Жэневе дзяржаў — удзельніц Канвенцыі аб забароне біялагічнай і таксіннай зброі пацвердзілі, што імі былі вывезены з тэрыторыі Украіны ўзоры патагенных штамаў і біяматэрыялаў украінцаў. Аб гэтым паведаміла ТАСС са спасылкай на заяву начальніка войскаў радыяцыйнай, хімічнай абароны УС РФ генерал-лейтэнанта Ігара Кірылава. Ён лічыць, што тлумачэнні прадстаўнікоў Украіны і Злучаных Штатаў Амерыкі гучалі дастаткова непераканаўча адносна вывазу «штамаў і біяматэрыялаў грамадзян Украіны і захавання этычных норм пры правядзенні даследаванняў». Размова ідзе аб даследаваннях, якія праводзіліся ў адносінах да людзей, якія праходзяць ваенную службу, малазабяспечаных грамадзян і адной з найбольш неабароненых катэгорый насельніцтва — пацыентах псіхіятрычных бальніц.

### У Італіі рост цэн на энерганосьбіты паставіць пад пагрозу звыш паўмільёна працоўных месцаў



Высокія цэны на энерганосьбіты ў Італіі налета могуць паставіць пад пагрозу больш чым 580 тысяч працоўных месцаў. Такія даныя агучаны ў даследаванні аналітычнага цэнтра пры асацыяцыі італьянскіх прамыслоўцаў Confindustria. Даследчыкамі разглядаліся два варыянты развіцця падзей. У першым выпадку планується скарачэнне валавога ўнутранага прадукту на 2,2 працэнта і ў сувязі з гэтым — змяншэнне колькасці занятых у эканоміцы на 383 тысячы чалавек. Прытрымліваючыся другога сцэнарыя, у Італіі мяркуецца падзенне ВУП на 3,2 працэнта на працягу бягучага і наступнага года, а разам з тым і скарачэнне 582 тысяч працоўных месцаў.

### У Францыі папярэдзілі аб магчымасці адключэння электрычнасці



Прэзідэнт французскага Камітэта па рэгуляванні энергетыкі (CRE) Эмануэль Варгон заявіла аб магчымым кропкавым адключэнні электрычнасці ў краіне. Аб гэтым паведаміла РІА «Навіны» са спасылкай на тэлеканал France Info. Эмануэль Варгон адзначыла, што зімой французы могуць сутыкнуцца з кропкавымі адключэннямі электрычнасці, якія могуць працягвацца да некалькіх гадзін у асобных камунах ці кварталах. Яна растлумачыла, што пры недахопе энергіі ўсім прадпрыемствам і хатнім гаспадаркам спачатку будзе разаслана апавяшчэнне аб неабходнасці скараціць спажыванне газу і электрычнасці. Калі ж гэты крок не вырашыць праблему, а Францыя не атрымаецца імпартаваць патрэбную колькасць энергарэсурсаў, магчымае адключэнне электрычнасці.

# Менавіта адзінства дазваляе пераадольваць выклікі, захоўваць і развіваць уласную дзяржаўнасць

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Бо ва ўсе часы менавіта адзінства дазваляе нам пераадольваць выклікі, захоўваць і развіваць уласную дзяржаўнасць.

Безумоўна, тым, што Рэспубліка Беларусь, нягледзячы на ўсе выпрабаванні і цяжкасці, нязменна застаецца месцам, дзе хочацца жыць, вучыцца, працаваць, выхоўваць дзяцей, мы, беларусы, шмат у чым абавязаны нашаму Прэзідэнту, нашаму нацыянальнаму лідару.

Дзякуючы мудрай палітыцы Кіраўніка дзяржавы на беларускай зямлі ў міры і згодзе жывуць людзі розных веравызнанняў, рэлігій, нацыянальнасцяў, этнічнай і расавай прыналежнасці, знаходзяць другі дом выхадцы з замежных краін.

У міжнародных адносінах нязменным павінна заставацца імкненне да пераадолення выклікаў сучаснасці шляхам супрацоўніцтва на аснове ўзаемнай павагі, даверу і суверэннай роўнасці бакоў. Беларусь заўсёды была і застаецца міралюбнай дзяржавай, якая шануе нармальныя добрасуседскія адносіны і сяброўства паміж народамі.

Пры ажыццяўленні міжнароднага супрацоўніцтва важна памятаць, што асноўная місія парламентарыяў на знешнім контуры — знаходзіць пункты судакранання, развіваць цывілізаваны дыялог паміж краінамі і народамі, садзейнічаць фарміраванню справядлівай міжнароднай супольнасці свабодных нацый.

У цяперашнюю сесію нам, парламентарыям, трэба прадоўжыць маштабную і інтэнсіўную заканатворчую работу, накіраваную на стварэнне прававых механізмаў укаранення прынятых на ўсенародным рэферэндуме змен і дапаўненняў у Асноўны Закон, а таксама на ўдасканаленне нацыянальнай прававой базы з улікам узнікаючых выклікаў і патрабаванняў часу.

Работа па прывядзенні законаў у адпаведнасць з канстытуцыйнымі навацыямі, на якую, нагадаю, адведзена два гады, ажыццяўляецца згодна з планам, зацверджаным прэм'ер-міністрам Рэспублікі Беларусь, старшынямі палат парламента, Кіраўніком Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Для забеспячэння эканамічнага дабрабыту нашай краіны і выканання дзяржавай сацыяльных абавязацельстваў перад людзьмі ўсе інстытуты ўлады абавязаны працаваць на поўную магутнасць, практычна ў мабілізацыйным рэжыме. Члены Савета Рэспублікі павінны прыкласці максімум намаганняў як на сваіх працоўных месцах у рэгіёнах, так і на пляцоўцы парламента.

Самую сур'ёзную ўвагу трэба аддаць падрыхтоўцы бюджэтнага пакета і законапраектам эканамічнага блока. Асноўныя прыярытэты бюджэтнай палітыкі застаюцца нязменнымі: фінансаванне ў поўным аб'ёме сацыяльных праграм, рост заработнай платы работнікаў бюджэтных арганізацый, збалансаванае развіццё рэгіёнаў, своечасовае абслугоўванне дзяржаўнага доўга. З асаблівай адказнасцю трэба падысці да прапрацоўкі змяненняў у Падатковы кодэкс.

У зоне пільнай увагі Савета Рэспублікі застаюцца законапраекты, накіраваныя на ўдасканаленне заканадаўства аб урэгуляванні неплацежаздольнасці, аб архітэктурнай, горадабудаўнічай і будаўнічай дзейнасці, грамадзянскага заканадаўства. Трэба таксама скарэктаваць заканадаўства, якое датычыцца ажыццяўлення гаспадарчай (эканамічнай) дзейнасці і аховы навакольнага асяроддзя.

У рамках пераразмеркавання паўнамоцтваў паміж органамі дзяржаўнай улады трэба будзе скарэктаваць законы «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь», «Аб абароне правоў спажыўцоў жыллёва-камунальных паслуг», «Аб дзяржаўных закупках тавараў (работ, паслуг)» у частцы аказання жыллёва-камунальных паслуг.

У бягучай сесіі дзейнасць Савета Рэспублікі будзе сканцэнтравана таксама на далейшым развіцці аховы здароўя, сацыяльнай абароны, працоўных адносін, дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі.

Хачу падкрэсліць, што прыняццем заканадаўчых актаў работа Савета Рэспублікі ў гэтым кірунку не абмяжоўваецца. Не менш важна ажыццяўляць пастаянны маніторынг рэалізацыі законаў на практыцы, у тым ліку шляхам вывучэння меркавання саміх правапрымяняльнікаў, і калі трэба — працягваць удасканаленне той ці іншай сферы. Самую сур'ёзную ўвагу неабходна надаць таму, як ажыццяўляюцца нарматыўныя прававыя акты, прынятыя ў адпаведнасці з канстытуцыйнымі навацыямі.

Акрамя таго, неабходна прадоўжыць тлумачальную работу сярод насельніцтва аб заканадаўчых рашэннях, якія прымаюцца. Людзі хочуць разумець, якім чынам працягваецца абнаўленне нацыянальнай прававой сістэмы, чакаюць адчувальных вынікаў.

Адным з прыярытэтаў дзяржаўнай палітыкі Рэспублікі Беларусь, вызначаных VI Усебеларускім народным сходам на 2021—2025 гады, з'яўляюцца моцныя рэгіёны. У сувязі з гэтым найважнейшым напрамкам дзейнасці Савета Рэспублікі заўсёды застаецца работа з насельніцтвам.

Не трэба чакаць, каб людзі ішлі да вас, — трэба самім ісці ў народ. Формы работы з насельніцтвам могуць і павінны быць самымі рознымі — гэта асабістыя прыёмы грамадзян, «прамыя тэлефонныя лініі», сустрэчы з працоўнымі калектывамі і грамадзянамі па месцы жыхарства, удзел у інфармацыйна-прапагандысцкіх групах, дыялогавых пляцоўках, выступленні ў сродках масавай інфармацыі. Важна не столькі, якую форму прымяняць, колькі тое, як яе прымяняць: трэба працаваць з людзьмі так, каб яны хацелі мець зносіны з вамі.

Яшчэ адно прынцыповае патрабаванне: усе людзі — розныя, але ўсе яны — нашы. Мы, члены Савета Рэспублікі, павінны працаваць аднолькава сумленна і адказна з усімі катэгорыямі і групамі насельніцтва ва ўсіх рэгіёнах краіны.

Нашымі ключавымі партнёрамі ў рэгіёнах павінны стаць Саветы дэпутатаў усіх узроўняў — варта выбудаваць з імі сістэмнае і самае цеснае супрацоўніцтва. Часцей запрашайце дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў на мерапрыемствы, якія вы праводзіце ў рэгіёнах, каб яны бачылі, як працуе Савет Рэспублікі, якія заканадаўчыя рашэнні прымаюцца, як на практыцы трэба прымяняць новаўвядзенні.

Кожны член Савета Рэспублікі павінен стаць своеасаблівым каардынатарам работы мясцовых Саветаў дэпутатаў у сваім рэгіёне. Лічыце сябе персанальна адказнымі за вынікі іх дзейнасці і будзьце гатовы праз некаторы час абмяняцца ў Савеце Рэспублікі вопытам і найлепшымі практыкамі сваёй работы ў гэтым напрамку.

Галоўнымі нашымі праваднікамі ў маладзёжным асяроддзі з'яўляюцца члены Маладзёжнага савета пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь. Заклікаю вас да актыўнага ўзаемадзеяння з шырокай маладзёжнай аўдыторыяй. Мы павінны адчуваць іх настроі, ведаць, якімі каштоўнасцямі яны кіруюцца і якія ў іх жыццёвыя стратэгіі, каб прымаць вывераныя рашэнні пры выпрацоўцы і рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі ў гэтай сферы.

Не менш важным напрамкам у рабоце з насельніцтвам з'яўляецца інфармацыйная дзейнасць Савета Рэспублікі. Перш за ўсё вы самі павінны быць зацікаўлены ва ўзаемадзеянні са сродкамі масавай інфармацыі, шукаць магчымасці для выказвання вашай прафесійнай, парламенцкай, грамадзянскай пазіцыі ў публічнай прасторы.

Упэўнена, што патэнцыял Савета Рэспублікі ў рабоце з насельніцтвам яшчэ не вычарпаны. Але што дакладна ніколі не зменіцца — гэта нацэленасць на максімальную карысць для нашай дзяржавы і нашага народа.

Чакаецца напружаная работа па выкананні мэтавых установак нашага Прэзідэнта, паважанага Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі, далейшай рэалізацыі рашэнняў VI Усебеларускага народнага сходу, Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на бягучую пяцігодку:

у галіне міжнародных адносін — садзейнічанне паглыбленню інтэграцыйных працэсаў у рамках Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі, актывізацыя супрацоўніцтва з дзяржавамі — удзельніцамі Садружнасці Незалежных Дзяржаў, Еўразійскага эканамічнага саюза, развіццё практычнага ўзаемадзеяння з краінамі «далёкай дугі»;

у заканадаўчай дзейнасці — стварэнне прававых механізмаў укаранення канстытуцыйных навацый, працяг уніфікацыі, гарманізацыі і збліжэння заканадаўства Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі, а таксама ўдасканаленне нацыянальнай прававой базы з улікам узніклых выклікаў і патрабаванняў часу;

у рабоце з насельніцтвам — правядзенне сустрэч з працоўнымі калектывамі, уважлівыя адносіны да кожнага звароту, эфектыўнае ўзаемадзеянне з моладдзю, грамадскімі структурамі і грамадзянскімі ініцыятывамі, цеснае супрацоўніцтва з мясцовымі Саветамі дэпутатаў, актыўная і прадуманая інфармацыйна-тлумачальная работа.

Мы, члены Савета Рэспублікі, — народныя прадстаўнікі і грамадзяне Рэспублікі Беларусь, — не маем ніякага маральнага права не апраўдаць ускладзеных на нас чаканняў Кіраўніка дзяржавы, нашай краіны і нашага народа. Мы павінны цалкам прысвячаць сябе самаадданаму служэнню нацыянальным інтарэсам нашай краіны.

# Забяспечыць непахіснасць канстытуцыйнага ладу...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Менавіта народнае адзінства дапамагала Беларусі пераадольваць усе выпрабаванні на сваім шляху. І толькі дзякуючы захаванню гэтага адзінства краіна працягвае сёння жыць у нармальным рытме, нягледзячы ні на якія знешнія пагрозы.

Але сітуацыя ў свеце становіцца ўсё больш трывожнай. Чалавецтва не проста за крок ад трэцяй сусветнай. Яна фактычна ўжо ідзе — у міжнародных адносінах, эканоміцы, у людскіх галовах — і ўсё больш перацякае ў гарачую фазу.

У такіх умовах толькі моцная дзяржава, заснаваная на нацыянальных традыцыях народаўладдзя, здольна надзейна абараніць сваіх грамадзян, умацаваць суверэнітэт і незалежнасць, забяспечыць высокую дынаміку эканамічнага росту і сацыяльны дабрабыт.

Але дзяржава — гэта ўсе беларусы. І момант ісціны сёння надышоў для ўсіх нас — тых, хто падтрымлівае ўладу, і тых, хто яе крытыкуе. Адсядзецца ўбаку не атрымаецца нікому. На кожным з нас ляжыць асабістая адказнасць за лёс нашай Радзімы.

Гэта цудоўна разумеюць парламентарыі, якім трэба будзе вырашыць сур’ёзныя задачы па заканадаўчым забеспячэнні рашэнняў VI Усебеларускага народнага сходу і канстытуцыйнага рэферэндуму.

Галоўнай з гэтых задач з’яўляецца прывядзенне заканадаўства ў адпаведнасць з абноўленай Канстытуцыяй. Асаблівы акцэнт неабходна зрабіць на прыняцці законаў у сферы дзяржаўнага будаўніцтва, без якіх канстытуцыйная рэформа не зможа запрацаваць на поўную моц.

Абноўленая Канстытуцыя сур’ёзна павышае вагу парламента ў сістэме дзяржаўных органаў. Таму пры падрыхтоўцы прапаноў трэба думаць не столькі пра тое, якія дадатковыя паўнамоцтвы нам патрэбны, колькі пра тое, што дзякуючы сваім паўнамоцтвам мы зможам прапанаваць выбаршчыкам.

Дэпутаты ўжо ўключыліся ў работу над праектамі законаў аб Прэзідэнце, Урадзе, судовым ладзе і канстытуцыйным судаводстве. Кожную іх норму трэба старанна прадумаць, каб на этапе разгляду ў Палаце прадстаўнікоў не губляць часу.

Зразумела, найважнейшым у канцэптуальным плане з’яўляецца законапраект “Аб Усебеларускім народным сходзе”. Менавіта з дзейнасцю гэтага органа грамадзяне звязваюць свае ўяўленні аб гарантыях непахіснасці канстытуцыйнага ладу, пераемнасці пакаленняў і грамадзянскай згоды. Наша задача — зрабіць усё, каб палажэнні будучага закона цалкам апраўдалі чаканні выбаршчыкаў.

Адначасова трэба працаваць і над фарміраваннем здаровага палітычнага клімату ў краіне, чаму павінны паслужыць своечасовае прыняцце законаў аб палітычных партыях і грамадскіх аб’яднаннях, грамадзянскай супольнасці, а таксама карэкціроўка Выбарчага кодэкса.

Неабходна стварыць такія ўмовы, пры якіх элементы палітычнай сістэмы, уцягнутыя ў працэс прыняцця дзяржаўных рашэнняў, не канфліктавалі б адзін з адным, а дзейнічалі салідарна, у рэчышчы адзінага курсу, ухваленага народам. Гэтае прынцыповае патрабаванне Прэзідэнта Беларусі павінна няўхільна выконвацца.

Паспешныя сацыяльныя і палітычныя эксперыменты занадта дорага абыходзяцца людзям. Прыкладаў таму ў гісторыі колькі заўгодна. Таму пры вызначэнні шляхоў партыйнага будаўніцтва і развіцця іншых грамадскіх інстытутаў трэба не спяшацца, а ісці ад жыцця, ад нашых рэалій.

Не менш важны заканадаўчы прыярытэт ляжыць у плоскасці тых мер, якія неабходна прыняць, каб ніве́ліраваць уплыў заходніх санкцый і забяспечыць паскораныя тэмпы развіцця нацыянальнай эканомікі.

Як падкрэсліў кіраўнік дзяржавы, людзі хочуць жыць у міры, дабрабыце і дастатку не заўтра, а тут і цяпер. Мы павінны імкнуцца да стварэння менавіта такой эканамічнай мадэлі. І шмат што залежыць ад кемлівасці заканадаўцаў.

Таму неабходна своечасова ўнесці запатрабаваныя бізнесам і грамадствам навацыі, якія датычацца архітэктурнай, горадабудаўнічай і будаўнічай дзейнасці, гаспадарчай дзейнасці, урэгулявання неплацежаздольнасці і ліцэнзавання. Адказна трэба падысці да работы над пакетам бюджэтна-падатковых законапраектаў. Павышанай увагі да сябе патрабуе і вырашэнне актуальных пытанняў сацыяльнага парадку дня.

Нарэшце, яшчэ адзін маштабны напрамак заканатворчасці датычыцца пераразмеркавання ўладных паўнамоцтваў.

Спатрэбіцца ўдумлівы аналіз дзеючага заканадаўства і праектаў законаў, якія паступаюць у Палату прадстаўнікоў у адпаведнасці з планам іх падрыхтоўкі на 2022 год, на прадмет мэтазгоднасці зрушэння цэнтраў цяжкасці ў прыняцці рашэнняў.

Вывучэнне практыкі прымянення заканадаўства важна і ў кантэксце паглыблення беларуска-расійскай інтэграцыі.

У нашых агульных інтарэсах — умацаваць эканамічны імідж Беларусі, Расіі і Саюзнай дзяржавы ў цэлым у вачах сусветнай супольнасці. Бо краін і народаў, не згодных з правіламі, якія навязваюць усяму свету ЗША і іх саюзнікі, на планеце большасць.

Важна выкарыстоўваць любую магчымасць, каб данесці нашу пазіцыю да тых палітычных сіл, у тым ліку і еўрапейскіх, якія стаміліся ад антыбеларускай рыторыкі і ўсведамляюць усю згубнасць палітыкі падвойных стандартаў, дыктату і санкцый.

Найважнейшым прыярытэтам для нас застаецца супрацоўніцтва на постсавецкай прасторы, на пляцоўках МПА СНД. З улікам трывожных тэндэнцый, якія атрымалі развіццё апошнім часам, сур’ёзна павышаюцца роля і значэнне ПА АДКБ як паўнацэннага абароннага блока. У хуткім часе Беларусь прыме старшынства ў гэтай Арганізацыі. І нам важна прадумаць формы і спосабы свайго ўдзелу ў рэалізацыі яе прыярытэтаў.

Што да работы з выбаршчыкамі, то нам тут трэба ўзмацніць ідэалагічны складнік. Год гістарычнай памяці шмат чаму нас навучыў. Найперш таму, што ніхто, акрамя саміх грамадзян Беларусі, не зацікаўлены ў яе росквіце. Толькі ўпартай працай, захаваннем адзінства і адказнай грамадзянскай пазіцыяй мы зможам забяспечыць на нашай зямлі мір і дабрабыт.

Нядаўна праведзеныя сацыялагічныя даследаванні паказалі высокі ўзровень даверу народа да ўлады. І мы абавязаны яго захаваць. Людзі, асабліва тыя, хто мае патрэбу ў падтрымцы дзяржавы, павінны ўвесь час адчуваць наша плячо.

**Цалкам выступленні спікераў на адкрыцці сесій чытайце на сайце zviazda.by**

# Пошта з ухілам на камфорт

**Пад рукой дырэктара Магілёўскага філіяла «Белпошты» Аляксандра БРУЧЫКАВА нататнік, дзе ён нешта пазначае пасля тэлефонных званкоў. Нават падчас інтэрв'ю не расслабляецца. Прызнаецца, што гэта недазволеная для яго раскоша. Наперадзе шмат работы і нельга губляць час. А тое, што зроблена, — маўляў, кропля ў моры. Для кіраўніка, магчыма, і кропля, але маштабы відаць збоку. Сёлета ў Магілёве адзін за адным набылі сучасны выгляд шэсць паштовых аддзяленняў. І работы працягваюцца. І хоць час для размовы быў абмежаваны, Аляксандр Бручыкаў паспеў акрэсліць збольшага тое, што зроблена, і якія сёння стаяць задачы перад поштай.**



***— У жніўні ў Магілёве адчыніла дзверы абноўленае 33-е паштовае аддзяленне на Юбілейным. Да паслуг кліентаў — больш прасторная зала чакання, зручны плацежна-даведкавы тэрмінал, камфортная мэбля. Прыемныя перамены адбыліся апошнім часам і ў цэнтральным 30-м аддзяленні. З'явілася, напрыклад, электронная чарга...***

**«Практычна ў кожнага нашага паштальёна на руках мабільная каса. Праз праграму «Мабільны паштальён» кліент можа аплаціць камунальныя паслугі, атрымаць пенсію, зрабіць грашовы перавод, аформіць падпіску, купіць тавар і гэтак далей».**

— Так, мы робім усё для таго, каб кліент адчуваў сябе як дома. Тое ж 33-е аддзяленне абслугоўвае мікрараён агульнай колькасцю 12 тысяч чалавек. Мы зацікаўлены, каб людзі былі задаволены. Што датычыцца 30-га аддзялення, то, сапраўды, там таксама ёсць зрухі. На першым паверсе зараз функцыянуе асобнае памяшканне бізнес-пошты. Раней адно акно абслугоўвала юрыдычных асоб на ўваходзе, а другое — у агульнай зале. Зараз мы ўсё цэнтралізавалі, устанавілі электронную чаргу, і кліенты вельмі задаволеныя. Не трэба бегаць ад аднаго акна да другога, каб абслужыцца хутчэй. Цяпер кавы папіў, і чарга падышла. Але асноўныя перамены ў 30-м аддзяленні яшчэ наперадзе. Мы плануем зрабіць больш сучаснай кліенцкую залу.

***— Якая ўвага аддаецца бяспецы супрацоўнікаў? Усе яшчэ ў шоку ад той трагедыі, што адбылася ў Оршы.***

— Для бяспекі супрацоўнікаў ведамства робіць усё магчымае. Клапоцімся, каб супрацоўнік адчуваў сябе камфортна і абаронена. Прымяняем шкленне рабочых месцаў да верху, дзвярныя замкі, каб кліент не мог прайсці ў рабочую зону. Гэта абарона і ад зламыснікаў, і ад інфекцый накшталт ковіду. Паралельна адукоўваем супрацоўнікаў, як весці сябе ў выпадку няштатнай сітуацыі. Але ж людзі могуць разгубіцца і нешта зрабіць не так.

***— Чым кіруецеся пры аднаўленні сваіх аддзяленняў? На што робіце акцэнт?***

— Абнаўляем у адпаведнасці з нашым брэндбукам, які адлюстроўвае асноўныя элементы карпаратыўнай палітыкі. Гэта і замена мэблі, і касметычны рамонт, там, дзе болей чым тры апараты, установка электроннай чаргі. Стараемся, каб і работнікам было камфортна, і кліентам зручна. Усё, вядома, залежыць ад фінансавання, але мы стараемся працаваць так, каб грошы ў нас былі. Цяжка ўсё адразу ахапіць, бо такіх аддзяленняў у нас болей чым 300.

***— Якія паслугі сёння развіваеце, чым прываблівaеце кліентаў?***

— Цяпер самая галоўная задача для пошты — лічбавізацыя паштовай сувязі. У нас укаранёная нацыянальная паштовая электронная сістэма, якая дазваляе перасылаць лісты ў анлайн-рэжыме з захаваннем юрыдычнай значнасці. Яе забяспечваюць электронныя паштовыя штэмпелі. Паслуга прывабная і для юрыдычных асоб, у якіх вялікія аб'ёмы карэспандэнцыі, і фізічных, якія цэняць свой час. Каб зарэгістравацца ў гэтай электроннай сістэме, трэба стварыць электронную скрыню на нашым сайце. Плюсы відавочныя: скарачаецца час дастаўкі карэспандэнцыі і яе кошт. Гэта так званая гібрыдная пошта. Калі ў кліента такой скрыні няма, а ў адрасанта ёсць, кліент усё роўна атрымае гэты ліст, але не ў электронным, а ў надрукаваным выглядзе.

Яшчэ адно новаўвядзенне — апаратны праграмны комплекс «Мабільны паштальён». Практычна ў кожнага нашага паштальёна на руках мабільная каса. Праз праграму «Мабільны паштальён» кліент можа аплаціць камунальныя паслугі, атрымаць пенсію, зрабіць грашовы перавод, аформіць падпіску, купіць тавар і гэтак далей.

**«У Год гістарычнай памяці паштовы праект «1030-годдзе праваслаўя на беларускіх землях» стане адной з важных старонак паштовага летапісу краіны».**

***— А на сяле гэтыя паслугі таксама даступныя?***

— Так. Сёння ўсё сяло аснашчана ў нас такімі праграмнымі комплексамі. Алічбаваны ўжо і сэрвіс «Паштовы кур'ер». Гэта мабільны дадатак, з дапамогай якога можна заказаць і аплаціць паштовае адпраўленне. Неабавязкова ісці на пошту, стаяць у чарзе — проста праз мабільны дадатак можна заказаць кур'ера і аддаць яму пасылку. Дзейнічае па прынцыпе таксі. Акрамя гэтага, з'явілася магчымасць атрымліваць паштовыя адпраўленні па sms-кодзе без прад'яўлення пашпарта і афармлення апавяшчэння. Для гэтага таксама трэба зарэгістравацца ў асабістым кабінеце на нашым сайце і ўвесці свае пашпартныя даныя. Калі прыйдзе пасылка, на тэлефон кліента паступіць sms замест папяровага паведамлення. Для атрымання паслання дастаткова назваць нумар тэлефона, указаны ў асабістым кабінеце, і атрымаць sms-код. Хутка і зручна. Паслуга, дарэчы, бясплатная. Наогул, з нашага сайта можна даведацца, чым лепш адправіць, на чым сэканоміць. Нават калькулятар ёсць, каб падлічыць, колькі будзе каштаваць адпраўленне.

**«Для бяспекі супрацоўнікаў ведамства робіць усё магчымае. Клапоцімся, каб супрацоўнік адчуваў сябе камфортна і абаронена. Прымяняем шкленне рабочых месцаў да верху, дзвярныя замкі, каб кліент не мог прайсці ў рабочую зону. Гэта абарона і ад зламыснікаў, і ад інфекцый накшталт ковіду».**

***— Інфарматызацыя паслуг дазваляе адмаўляцца ад празмернага папяровага патоку і паскорыць працэс атрымання паслання. З якімі тэмпамі ідзе гэта работа?***

— Альтэрнатывай для авансавых кніжак, з якімі раней працавалі паштавікі, сталі электронныя асабовыя рахункі. Гэта паслуга асабліва запатрабаваная юрыдычнымі асобамі. Зараз работа ажыццяўляецца як у электронным выглядзе, так і па авансавай кніжцы. Электронныя асабовыя рахункі, сапраўды, добрыя тым, што скарачаюць той папяровы паток, які існаваў раней. І мы актыўна працуем у гэтым кірунку.

***— Паштаматы — таксама адно з апошніх новаўвядзенняў. Як ідзе іх укараненне?***

— На жаль, не тымі тэмпамі, якімі хацелася б, хаця перавагі паслугі відавочныя. Не трэба стаяць у чарзе, адпрошвацца з работы, каб забраць пасылку. Ужо пры знаходжанні пасылкі на мытным тэрмінале можна пераадрасаваць яе ў паштамат, які працуе круглыя суткі. Каб скарыстацца паслугай, зноў-такі трэба спачатку зарэгістравацца ў асабістым кабінеце. Мінус пакуль у тым, што паштамат можа выдаць толькі міжнародную карэспандэнцыю. Але ў перспектыве і ўнутраная пошта будзе працаваць праз паштаматы.

***— А як ідзе развіццё паштовай галіны на сяле?***

— Мы прыводзім у парадак сельскія аддзяленні гэтак жа, як і гарадскія. Плюс мы пераабсталёўваем іх у паштамаркеты, паколькі наша ведамства на вёсцы яшчэ і актыўна гандлюе. Нашы паштамаркеты ўяўляюць сабой крамы з залай самаабслугоўвання, дзе можна адначасова атрымаць паштовыя паслугі і купіць нешта карыснае для сябе.

***— Вашы супрацоўнікі нядаўна апрануліся ў форменнае адзенне. Гэта таксама дысцыплінуе?***

— Так. Да таго ж гэта проста прыгожа. Не параўнаць з тым, як было. Усё гэта культура прадпрыемства, якая падкрэслівае яго значнасць.

***— Раней пошта асацыявалася з газетамі, лістамі, паштоўкамі. Цікава, а зараз людзі пішуць адно аднаму лісты?***

— Пішуць, яшчэ як. І буккросінг папулярны не менш, чым раней. І ад гэтага мы ніколі не сыдзем. Перасылаем і дакументы, і асабістыя лісты, і іншыя папяровыя носьбіты.

***— Што дае асноўныя даходы ў вашай сістэме?***

— Перш за ўсё паштовыя паслугі.

***— Ваша прадпрыемства прымае актыўны ўдзел у культурных падзеях краіны, праводзіць конкурсы. Якія праекты, прысвечаныя Году памяці, запланаваны на найбліжэйшы час?***

— Сёлета споўнілася 1030 гадоў з моманту ўзнікнення Полацкай епархіі, што лічыцца датай заснавання праваслаўнай царквы на беларускіх землях. 22 верасня Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь выпускае ў абарачэнне паштовы блок «1030-годдзе праваслаўя на беларускіх землях». У гэты дзень на паштамце Мінска і на некаторых іншых аддзяленнях паштовай сувязі краіны, у тым ліку ў Бабруйску і Магілёве, будуць праводзіцца спецыяльныя гашэнні на канверце «Першы дзень».

У Год гістарычнай памяці паштовы праект «1030-годдзе праваслаўя на беларускіх землях» стане адной з важных старонак паштовага летапісу краіны.

***— Дзявятага кастрычніка будзе адзначацца Сусветны дзень сувязі. Што б вы хацелі пажадаць сваім супрацоўнікам?***

— Жадаю ўсім моцнага здароўя, міру, шчасця і дабрабыту. Цаніце сваіх блізкіх і не губляйце сувязі з тымі, хто вам дарагі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

---

Новыя кнігі

# Падарожжа да старадаўніх сядзіб:

## запрашаем у Свіслач і Слонім

**У Выдавецкім доме «Звязда» падрыхтавана да выдання кніга легендарнага даследчыка сядзібна-паркавага комплексу Беларусі доктара біялагічных навук Анатоля ФЕДАРУКА «Старадаўнія сядзібы Гродзеншчыны: Свіслацкі раён, Слонімскі раён».**



**Палацава-паркавы комплекс Бутаўт-Андрайковічаў у Багудзеньках (Поразава).**

Багата ілюстраванае выданне расказвае пра 24 адрасы гістарычнай памяці толькі ў двух раёнах Гродзеншчыны. Раней ужо выходзілі кнігі А. Федарука, прысвечаныя іншым раёнам гэтага рэгіёна. У 2013 годзе — том, прысвечаны сядзібам толькі Карэліцкага раёна. Тады ініцыятарам выдання стала ўстанова «Музей «Замкавы комплекс «Мір» і асабіста кандыдат гістарычных навук Вольга Папко. У 2014 годзе — працяг даследавання: кніга, у якой даследчык сабраў звесткі пра гісторыю з'яўлення, развіцця і сучасны стан сядзіб Бераставіцкага, Ваўкавыскага, Воранаўскага, Гродзенскага, Дзятлаўскага, Зэльвенскага і Іўеўскага раёнаў. У 2020 годзе, пасля вялікага перапынку, звязанага з хваробай Анатоля Тарасавіча, выйшла трэцяя кніга, прысвечаная Гродзеншчыне. Пад адной вокладкай — распавед пра сядзібы Лідскага, Мастоўскага, Навагрудскага, Астравецкага і Ашмянскага раёнаў. Згаданыя кнігі пабачылі свет у выдавецтве «Беларусь».

11 жніўня 2022 года Анатоль Тарасавіч пайшоў з жыцця. Выданне сабраных ім гісторыка-краязнаўчых матэрыялаў пра сядзібна-паркавае мастацтва на Гродзеншчыне стала справай гонару і кнігавыдаўцоў, і родных, і блізкіх даследчыку людзей. І вось зараз да чытача прыходзіць працяг даследавання — пра свіслацкія і смаргонскія сядзібы. Праз фотаздымкі, планы, лаканічны інфармацыйны аповед вас чакаюць сустрэчы з Багудзенькамі (гэта ў Поразаве), Валіцкоўшчызнай (вёска Валіскаўшчына), Вярдомічамі, Гарнастаевічамі, Ляскамі (у Навасадах), Свянціцай (вёска Вялікая Свянціца), Свіслаччу, Хараўшчызнай (вёска Рудня), Якушоўкай — у Свіслацкім раёне. А яшчэ — з Альберцінам (у Слоніме), Бікевічамі (вёска Рудаўка), Высоцкам, Грыбавам (вёска Чамяры), Дзевятковічамі (вёска Навадзевятковічы), Дзеравянчыцамі, Ісаевічамі, Клепачамі, Львоўшчынай, Акунінавам, Парэччам, Слонімам (сядзіба па вуліцы Оперная ў раённым цэнтры), Старымі Жыровічамі (вёска Заверша), Хмяльніцай, Шыдлоўцамі (вёска Шылавічы) — гэта ў Слоніме і Слонімскім раёне.

Кніга нараджалася няпроста. Анатоль Тарасавіч хварэў. Было б іначай — можна было б адказы на многія пытанні знайсці прасцей. Вольга Папко зазначае ў прадмове да кнігі: «...На наш зварот адгукнуліся многія фатографы, калекцыянеры, супрацоўнікі музеяў і бібліятэк, а таксама нашчадкі ўладальнікаў сядзіб, якія падзяліліся здымкамі са сваіх сямейных архіваў, што значна ўзбагаціла кнігу. За дапамогу ў працы над рукапісам і архівам аўтара выказваем асаблівую ўдзячнасць яго дачцэ, Наталлі Анатольеўне Федарук, якая з'яўляецца нязменным паплечнікам бацькі, без яе публікацыя кнігі была б немагчымай. Словы ўдзячнасці ўсім, хто быў побач з Анатолем Тарасавічам у яго паездках па краіне, дапамагаў у правядзенні экспедыцыйных даследаванняў, а таксама старажылам паселішчаў, у якіх захаваліся сядзібы, за іх любоў да роднага краю і памяць пра мінулае».

Несумненна, новы том з цыкла «Старадаўнія сядзібы Гродзеншчыны» стане падзеяй для айчыннага чытача, для ўсіх, хто нераўнадушна ставіцца да гісторыі і культуры Беларусі.

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

# ЧХАЦЬ НА ВІРУСЫ

## Ці прышчапляцца сёлета ад грыпу?

**На долю вострых рэспіраторных інфекцый прыпадае каля 95 % ад усіх інфекцыйных хвароб. Уздым захваральнасці пачынаецца, як правіла, з наступленнем халадоў. У гэты перыяд медыкі раяць прышчапіцца не толькі ад каранавіруса, але і ад грыпу.**

**У апошнія пару гадоў ён адышоў на задні план, саступіўшы пазіцыі COVID-19. Аднак канчаткова спісваць яго з рахункаў нельга. Вірусолагі, наадварот, чакаюць яго вяртання. Прычым у некаторых краінах Паўднёвага паўшар'я грып ужо заявіў пра сябе вельмі гучна. Напрыклад, паказчыкі захваральнасці ў Аўстраліі пабілі рэкорды апошніх пяці гадоў.**

**Што чакаць сёлета ў нас? Каму варта прышчапіцца ў першую чаргу? Якія вакцыны будуць даступныя і наколькі яны эфектыўныя? Ад чаго прышчапляцца ў першую чаргу: ад грыпу ці COVID-19? На гэтыя і іншыя пытанні адказалі спецыялісты.**



### Якія вірусы небяспечныя?

Рост рэспіраторных захворванняў пачынаецца з кастрычніка і працягваецца да 20 каляндарнага тыдня наступнага года (сярэдзіна мая), паведаміла **загадчык лабараторыі грыпу і грыпападобных захворванняў РНПЦ эпідэміялогіі і мікрабіялогіі Наталля ШМЯЛЁВА.** Ёсць вялікая колькасць рэспіраторных вірусаў, якія схільны выклікаць вірусныя інфекцыі, што валодаюць агульнымі рысамі клінічных праяў. Гэта і добра вядомыя вірусы грыпу, парагрыпу, адэнавірусы, рэспіраторна-сінцыцыяльныя вірусы. А таксама і новыя вірусы, аб існаванні якіх мы даведаліся ў апошняе дзесяцігоддзе дзякуючы сучасным магчымасцям малекулярнай біялогіі і развіццю малекулярна-біялагічных метадаў даследавання. Да іх можна аднесці метапнеўмавірус, бокавірус, з нядаўняга часу і новы каранавірус.

З вялікай колькасці вірусаў несумненнай актуальнасцю валодаюць грып і каранавірус, якія здольны выклікаць эпідэміі і пандэміі.

### Колькі тыпаў віруса грыпу?

У чалавечай папуляцыі актыўна цыркулююць два тыпы віруса грыпу — А і В. Ёсць і тыпы С і D, але яны менш актуальныя. Пра той жа вірус тыпу D мы даведаліся толькі ў апошняе дзесяцігоддзе, ён інфіцыруе буйны рагаты скот і вельмі рэдка — людзей. Што датычыцца вірусаў тыпу С, то яны інфіцыруюць пераважна дзяцей да пяці гадоў.

Сярод вірусаў тыпу А, якія актыўна цыркулююць сярод людзей, вылучаюць два падтыпы. Гэта вірусы H1N1 і H3N2. Доля вірусаў В таксама ў папуляцыі неаднародная. З 80-х гадоў мінулага стагоддзя цыркулююць дзве яго эвалюцыйныя лініі: «Вікторыя» і «Ямагата». Варта адзначыць, што вірусы цыркулююць амаль адначасова: штогод усе чатыры гэтыя варыянты сустракаюцца ў чалавечай папуляцыі, дамінуе адзін або некалькі.

Дарэчы, прыродным рэзервуарам грыпу А з'яўляюцца птушкі. Менавіта ў іх асяроддзі знаходзіцца тая вялікая разнастайнасць вірусаў грыпу, вядомых нам. Вірусы грыпу могуць інфіцыраваць розных жывёл, у прыватнасці вірусы тыпу А. Але толькі два арганізмы — чалавека і свінні — могуць быць інфіцыраваны ўсімі вірусамі грыпу — А, В С і D.

### Як COVID-19 паўплываў на грып?

У апошнія гады пандэмія каранавіруса ўнесла свае карэктывы ў развіццё эпідэмічнага працэсу. З'яўленне гэтага новага ўзбуджальніка прывяло да таго, што вірус грыпу і многія іншыя былі выціснуты з актыўнай цыркуляцыі.

— У першы год распаўсюджання каранавіруса мы амаль не назіралі цыркуляцыі вірусаў грыпу. Спачатку гэта спісвалі на тое, што дыягностыка ў адносінах грыпу пакутавала, бо ўсе рэсурсы былі накіраваны на выяўленне новага каранавіруса. Аднак у хуткім часе сусветная лабараторная сетка была адбудавана і функцыянавала ў ранейшых аб'ёмах, але рэгістравала адзінкавыя выпадкі грыпу, — кажа Наталля Шмялёва.

### Вярнуліся летась

У мінулым эпідэмічным сезоне вірусы грыпу вярнуліся, хоць іх цыркуляцыя і не была такой актыўнай, як у дапандэмічны перыяд. Эпідэмічныя пад'ёмы захваральнасці на грып былі зарэгістраваны амаль ва ўсіх краінах.

На еўрапейскім кантыненце летась назіралі два эпідэмічныя пад'ёмы захваральнасці. У асенне-зімовы перыяд у лістападзе-снежні ў шэрагу краін Усходняй Еўропы назіраўся эпідэмічны ўздым віруса грыпу тыпу А (H3N2). У краінах Цэнтральнай і Заходняй Еўропы гэты пад'ём прыйшоўся на больш позні, вясенні перыяд, з працяглай (больш за 12 тыдняў) цыркуляцыяй. І тут таксама пераважаў падтып H3N2. Вірусы грыпу актыўна цыркулявалі летась да 20-га каляндарнага тыдня. Гэта сведчыць пра тое, што грып вяртаецца ў актыўную цыркуляцыю.

Пра яго вяртанне кажуць і асаблівасці эпідэмічнага перыяду, якія перажылі краіны Паўднёвага паўшар'я, дзе зараз завяршаецца зіма. Напрыклад, уздым захваральнасці на грып, якога не памятаюць у апошнія гады, рэгістраваўся ў Аўстраліі.

— Краіна доўгі час знаходзілася ў жорсткіх каранцінных умовах. Каб мінімізаваць распаўсюджанне новага каранавіруса, там прытрымліваліся тактыкі нулявой захваральнасці і доўга былі закрытыя для іншых краін. Толькі нядаўна Аўстралія адкрылася, і медыкі пачалі выяўляць шматлікія выпадкі грыпу. Такія высокія паказчыкі гэта краіна не рэгістравала апошнія пяць гадоў. За той час, пакуль Аўстралія прытрымлівалася каранцінных мерапрыемстваў, імунная праслойка тых, хто валодае імунным аховай да віруса грыпу, зменшылася. Таму быў такі значны пад'ём захваральнасці, — тлумачыць Наталля Шмялёва.

### Што нас чакае гэтай зімой?

У цяперашні час у краінах Еўропы назіраецца пад'ём захваральнасці, і вірусы грыпу актывізуюцца. Напрыклад, у Партугаліі назіраецца іх высокая актыўнасць.

— Гэта сведчыць пра тое, што сёлета, верагодна, будзе больш ранні пачатак эпідэмічнай захваральнасці, звязанай з вірусам грыпу, — адзначае Наталля Шмялёва.

У гэтым сезоне ў свеце дамінуюць вірусы грыпу тыпу А — больш за 90 %. А сярод іх лідзіруе H3N2. Але нельга забываць і пра вірус H1N1 — у Індыі цяпер назіраецца пад'ём захваральнасці, звязаны менавіта з ім.

Што датычыцца віруса тыпу В, то ў мінулым эпідэмічным сезоне ён практычна не цыркуляваў. А значыць, верагоднасць яго актыўнасці сёлета таксама павышаецца.

— Звычайна рэзкі рост захваральнасці звязаны з тыпам А. А ў канцы эпідэмічнага пад'ёму захваральнасці далучаецца тып В і фарміруе так званы постэпідэмічны «хвост», — удакладняе суразмоўца.

### Ці можна заразіцца адначасова грыпам і COVID-19?

Вірусы грыпу могуць цыркуляваць як адначасова з COVID-19, так і па чарзе выклікаць пад'ём захваральнасці. У мінулым сезоне, напрыклад, пад'ёмы чаргаваліся. Таму высокая верагоднасць быць інфіцыраваным як адначасова, так і захварэць па чарзе.

Вось чаму пра сваё здароўе лепш паклапаціцца загадзя. Варта памятаць, што адзіным даказаным метадам прафілактыкі з'яўляецца вакцынацыя. І яе мэта — папярэдзіць не захворванне, а цяжкі ход хваробы і лятальны вынік.

### Наколькі эфектыўныя прышчэпкі супраць грыпу?

На працягу апошніх васьмі сезонаў ахоп прафілактычнымі прышчэпкамі супраць грыпу дасягнуў і перавысіў 40 %. Іх эфектыўнасць медыкі не аспрэчваюць. Аналіз захваральнасці на грып сярод прышчэпленага і непрышчэпленага насельніцтва паказаў, што захваральнасць на грып сярод прышчэпленых у 9,6 раза ніжэйшая, чым захваральнасць непрышчэпленых.

### Хто ў групе рызыкі?

У 2022 годзе ў Беларусі плануецца правесці поўны аб'ём вакцынацыі супраць грыпу, паведаміў **загадчык аддзялення імунапрафілактыкі Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Кірыл ІГНАТАЎ.** У першую чаргу абарона ад грыпу важная для тых, у каго высокая рызыка цяжкага ходу захворвання і неспрыяльных наступстваў. Гэта дзеці ад шасці месяцаў да трох гадоў, дзеці ад трох гадоў і дарослыя з хранічнымі захворваннямі і імунадэфіцытнымі станамі, людзі, старэйшыя за 65 гадоў, цяжарныя жанчыны, медыцынскія і фармацэўтычныя работнікі, дзеці і дарослыя, якія жывуць ва ўстановах з кругласутачным рэжымам знаходжання, работнікі дзяржорганаў, якія ствараюць бяспеку дзяржавы і жыццядзейнасць насельніцтва. Акрамя таго, вакцынацыю лепш не ігнараваць работнікам адукацыі, гандлю, грамадскага харчавання, камунальнай і іншых галін дзейнасці.

### Ці можна адначасова прышчапіцца ад грыпу і COVID-19?

Вакцынацыя супраць грыпу ў 2022 годзе будзе праходзіць на фоне пандэміі COVID-19, якая працягваецца, і вакцынацыі супраць гэтага захворвання. Таму ў тактыку вакцынацыі ўнесены змяненні. Пры гэтым улічвалі пазіцыі міжнародных і айчынных экспертаў, а таксама рэкамендацыі вытворцаў вакцын. Згодна з распараджэннем Міністэрствам аховы здароўя парадкам вакцынацыі супраць COVID-19, дапускаецца сумеснае, у адзін дзень, прымяненне вакцыны супраць грыпу і COVID-19. Яшчэ адзін варыянт — пасля вакцынацыі ад COVID-19 перад увядзеннем другой вакцыны зрабіць мінімальны інтэрвал — два тыдні.

Сёння працягваецца вакцынацыя супраць каранавіруснай інфекцыі, і тым, хто завяршыў асноўны курс вакцынацыі ці бустэрную вакцынацыю шэсць і больш месяцаў таму, неабходна яшчэ адна прышчэпка ад COVID-19. Яна дапаможа падтрымаць імунітэт. Такія рэкамендацыі даюць як міжнародныя, так і айчынныя эксперты.

### Якія вакцыны даступныя?

У 2022 годзе ў склад вакцын для прафілактыкі грыпу ўнесены змяненні па дзвюх пазіцыях: супраць віруса грыпу А тыпу H3N2 і віруса грыпу В.

У гэты эпідсезон будуць даступныя вакцыны расійскай і французскай вытворчасці. Расійская трохвалентная вакцына «Грыпол плюс» будзе бясплатная. Для вакцынацыі за ўласныя грошы прапануецца чатырохвалентная вакцына «Ваксігрып тэтра». У яе склад дадаткова ўключаны кампанент супраць штама грыпу В.

### Калі можна будзе прышчапіцца?

Сёлетняя кампанія па вакцынацыі плануецца з кастрычніка да снежня. Вакцына «Грыпол плюс» ужо паступіла ў Беларусь. Яна праходзіць праверку якасці і бяспекі і адразу пасля гэтага паступіць ва ўстановы аховы здароўя. Вакцына французскай вытворчасці плануецца да пастаўкі ў нашу краіну ў пачатку кастрычніка.

— Такі перыяд для вакцынацыі выбраны невыпадкова, кажа Кірыл Ігнатаў. — Гэта дазваляе прышчапіць неабходныя групы рызыкі, а таксама працоўныя і калектывы ўстаноў адукацыі. Паколькі пад'ём захваральнасці на рэспіраторныя інфекцыі звычайна пачынае рэгістравацца са снежня, вакцынацыя загадзя дазваляе выпрацавацца імунітэту, каб знізіць рызыку інфіцыравання і не даць развіцца цяжкаму ходу хваробы.

### Што рабіць, калі кантактавалі з хворым?

— Экстранная прафілактыкі як такой няма. Калі кантактавалі з хворым, ісці на вакцынацыю няма сэнсу, бо яе трэба праводзіць загадзя. Можна выкарыстоўваць супрацьгрыпозныя прэпараты, у прыватнасці інгібітары нейраменітазы, — кажа Наталля Шмялёва.

### Ці дапамогуць фітапрэпараты і вітаміны?

— У першую чаргу верагоднасць развіцця захворвання залежыць ад двух складнікаў — стану імуннай сістэмы і асаблівасцяў узбуджальніка, яго патагенных уласцівасцяў. На ўзбуджальнік мы не ў сілах паўплываць, а вось на стан арганізма можам. Таму не варта забываць пра здаровы лад жыцця, які накіраваны на ўзмацненне імунітэту. Фітапрэпараты таксама могуць падтрымаць наш імунітэт, — тлумачыць Наталля Шмялёва. — Калі казаць пра мазі, то яны ствараюць пэўны фізічны бар'ер, у прыватнасці ў носе. Ён можа зменшыць колькасць узбуджальніка, які пастулае ў наш арганізм.

Для падтрымання імунітэту ў халодны перыяд можна прымаць полівітамінныя комплексы.

### Ці дапаможа знізіць рызыку інфіцыравання прамыванне носа?

— Прамыванне носа саляным растворам, вядома, садзейнічае таму, каб узбуджальнік не трапіў у арганізм. Але гэта не панацэя. Лепш выкарыстоўваць банальныя маскі. Гэта зменшыць верагоднасць траплення віруса, — раіць вірусолаг.

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

21 верасня 2022 г. № 36 (672)

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


# ЯК НІКОЛІ АДЧУЦЬ АДЗІНСТВА



Фота БелТА.

**Дзень, які нагадвае пра няпросты лёс беларускага народа. Дзень, які прымушае згадаць гісторыю сваёй краіны. Дзень, калі варта падзякаваць продкам за тое, што ў нас ёсць сёння. Краіна адзначыла самае маладое дзяржаўнае свята — Дзень народнага адзінства. Пра значэнне 17 верасня ў гісторыі Беларусі напісана і сказана шмат. Многае яшчэ варта ўсвядоміць. Але тое, што гэты дзень не згубіўся ў падручніках гісторыі і шырока адзначаецца беларусамі, сведчыць аб правільнасці ўзятага курсу. Як заўважыла старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА, Дзень народнага адзінства становіцца адным з любімых свят беларусаў.**

«Таму што мы як ніколі можам адчуць сапраўды адзінства ўсяго нашага народа, адзінства душ, імкненняў зрабіць сваю краіну лепшай, прыгажэйшай. Нават людзі, мне здаецца, становяцца бліжэйшымі адзін да аднаго. Праводзяцца рознага роду мерапрыемствы, якія дазваляюць нам аб'ядноўвацца ў вырашэнні не толькі нейкіх глабальных пытанняў: захавання міру, незалежнасці, што вельмі важна, але нават у такіх пытаннях, калі мы дапамагаем дзецям, сустракаемся ў аўдыторыях з людзьмі, моладдзю, калі абмяркоўваем тое, што хвалюе сёння нашых грамадзян», — адзначыла яна ў эфіры Першага нацыянальнага канала Беларускага радыё.



Спікер падзялілася, што асабіста для яе Дзень народнага адзінства — гэта ўспаміны сваіх родных і блізкіх, нагода задумацца, кім былі продкі. А калі браць у цэлым, то, вядома, успаміны нашай гісторыі — слаўнай, знакавай, значнай і трагічнай. «І таму, вядома, гэта добрае, светлае свята, якое, відавочна, становіцца любімым для нашай краіны. Калі мы разважаем аб тым, што нам трэба захоўваць гістарычную памяць, ведаць свае карані, сваю гісторыю для таго, каб у далейшым развіваць краіну, мне падаецца, гэта вельмі відавочныя факты для кожнага, бо паасобку ўзяты чалавек памятае, аналізуе сваё жыццё: як пражыў правільна-няправільна, што было зроблена не так, што яшчэ трэба рабіць для таго, каб тваё жыццё было лепшым. Роўна так і для краіны. Краіна — гэта жывы арганізм. Таму, канешне, мы павінны памятаць, улічваць тыя ўрокі гісторыі, якія не павінны паўтарыцца. І, наадварот, светлыя старонкі нашай гісторыі, яркія асобы, якія зрабілі шмат для станаўлення нашай краіны, — мы павінны аб гэтым ведаць, каб прымаць правільныя рашэнні, накіраваныя на далейшае развіццё нашай краіны, але і для таго, каб захаваць нашу краіну», — падкрэсліла Наталля Качанава.

Спікер верхняй палаты парламента заўважыла, што ўжо стала добрай традыцыяй да Дня народнага адзінства праводзіць патрыятычныя форумы, куды збіраюцца людзі з усёй краіны. Па яе словах, на такіх мерапрыемствах адчуваецца адзінства душ і імкненне да лепшага.

Журналісты «Звязды» таксама даведаліся, якія ўражанні ад Дня народнага адзінства засталіся ў сенатараў па ўсёй краіне.

## ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



## Эканамічная інтэграцыя і гарантыі абароненасці

### Падчас першага пасяджэння дзясятай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу сёмага склікання разгледжаны тры законапраекты

У прыватнасці, адобраны праект Закона «Аб ратыфікацыі Пратакола аб унясенні змяненняў у Дагавор аб Еўразійскім эканамічным саюзе ад 29 мая 2014 года». Як паведаміў **міністр юстыцыі Сяргей ХАМЕНКА,** прадстаўлены на разгляд пратакол рэгулюе адносіны, якія знаходзяцца ў кампетэнцыі не менш 20 дзяржаўных органаў і арганізацый Рэспублікі Беларусь. «Дакумент устараняе праблемы ў прававым рэгуляванні, выяўленыя ў ходзе правапрымяняльнай практыкі, а таксама ўдакладняе тэрміналогію, якая выкарыстоўваецца ў дагаворы, — звярнуў увагу міністр. — Пратакол забяспечвае рэалізацыю палажэнняў стратэгічных кірункаў развіцця еўразійскай эканамічнай інтэграцыі да 2025 года».

У законапраект унесена 130 папраўак, якія датычацца пытанняў самых розных сфер дзейнасці. Ратыфікацыя Пратакола дазволіць павысіць узровень інтэграцыі ў межах Еўразійскага эканамічнага саюза, стварыўшы прававыя ўмовы для развіцця эканамічнай кааперацыі паміж суб'ектамі гаспадарання, а таксама павысіць гарантыі абароненасці ў сённяшніх сацыяльна-эканамічных рэаліях. Па словах **старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргея РАЧКОВА,** палажэнні пратакола накіраваны на рэалізацыю асобных пунктаў плана мерапрыемстваў па рэалізацыі стратэгічных кірункаў еўразійскай эканамічнай інтэграцыі да 2025 года, у прыватнасці, па пытаннях тэхнічнага рэгулявання, санітарыі, ветэрынарыі і фітасанітарыі. Згодна з пратаколам, Еўразійская эканамічная камісія надзяляецца дадатковымі паўнамоцтвамі на правядзенне ацэнкі, што рэгулюе ўздзеянне праектаў міжнародных дагавораў у межах Еўразійскага эканамічнага саюза, якія могуць аказаць уплыў на ўмовы вядзення прадпрымальніцкай дзейнасці. Пратакол заклікаецца вырашыць шэраг пытанняў, якія ўзнікаюць пры адміністраванні ўскосных падаткаў ва ўзаемным гандлі суб'ектаў гаспадарання дзяржаў — членаў ЕАЭС.

Зацвердзілі сенатары і законапраект «Аб ратыфікацыі Пратакола аб унясенні змяненняў у Дагавор аб Еўразійскім эканамічным саюзе ад 29 мая 2014 года ў частцы пенсіённага забеспячэння службовых асоб і супрацоўнікаў Еўразійскай эканамічнай камісіі і Суда Еўразійскага эканамічнага саюза, якія з'яўляюцца грамадзянамі Расійскай Федэрацыі». Па словах **міністра працы і сацыяльнай абароны Ірыны КАСЦЕВІЧ,** дакумент утрымлівае палажэнні аб сацыяльных гарантыях, прывілеях і імунітэтах у Еўразійскім эканамічным саюзе. У першую чаргу гэта датычыцца пенсіённага забеспячэння.

Парламентарыі разгледзелі праект Закона «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб ажыццяўленні аўдытарскай дзейнасці ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза». Прадстаўляючы законапраект, **першы намеснік міністра фінансаў Дзмітрый КІЙКО** заўважыў, што прадметам пагаднення з'яўляецца рэгуляванне адносін, звязаных з забеспячэннем доступу аўдытарскіх арганізацый і індывідуальных аўдытараў адной дзяржавы-члена да ажыццяўлення аўдытарскай дзейнасці ў іншых дзяржавах-членах. Пагадненне дае суб'ектам гаспадарання дзяржаў-членаў права на пастаўку і атрыманне аўдытарскіх паслуг без абмежаванняў і адабранняў, вызначае адзіныя падыходы да ажыццяўлення і рэгулявання аўдытарскай дзейнасці ў дзяржавах-членах, забяспечвае прызнанне кваліфікацыйных атэстацый аўдытараў і аўдытарскіх заключэнняў, справаздач, якія выдаюцца аўдытарскай арганізацыяй, індывідуальным аўдытарам адной дзяржавы-члена на тэрыторыі іншых дзяржаў-членаў і інш.

**Вераніка КАНЮТА.**

# ЯК НІКОЛІ АДЧУЦЬ

## ЧУЖОГА НАМ НЕ ТРЭБА, АЛЕ СВАЙГО НЕ АДДАДЗІМ

**Алена ЗЯБЛІКАВА, член Савета Рэспублікі, старшыня Барысаўскага раённага аб'яднання прафсаюзаў:**



— Другі год у нашай краіне адзначаецца Дзень народнага адзінства. Гэта актуальнае і важнае для беларусаў свята. Геапалітычнае супрацьстаянне, новыя гарачыя канфлікты прывялі да пераацэнкі значнасці падзей ва ўсім свеце. Таму Дзень народнага адзінства — 17 верасня — з'яўляецца яшчэ адным напамінам аб непарушнасці і самадастатковасці беларускай нацыі і дзяржавы, фарміруе пачуццё датычнасці да лёсу краіны і кожнага грамадзяніна.

Жнівень 2020 года прымусіў нас паглядзець на свет іншымі вачыма. Наша грамадства стала мацнейшае, яно кансалідавалася, таксама ў людзей узрасла ўвага да айчыннай гісторыі. 17 верасня — гэта не толькі 1939 год, не толькі ўз'яднанне БССР, гэта і пра нас з вамі.

Лічу, што свята народнага адзінства ўяўляе сабой працяг працэсу ўмацавання нашага суверэнітэту, незалежнасці, гістарычнай праўды. Як адзначыў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў сваёй прамове з нагоды Дня народнага адзінства 17 верасня, гэта ўдзячнасць сучаснікаў папярэднім пакаленням, якія адстаялі права вырашаць свой лёс. Ён усяляе гонар за краіну і дае асэнсаванне таго, што мы адзіны народ. Сапраўды, мы самастойная дзяржава і самі ў праве вырашаць, як нам жыць далей, вызначаць свой лёс.

Дзень народнага адзінства я правяла разам з барысаўчанамі на нашым агульным мерапрыемстве, прымеркаваным да гэтай значнай падзеі. Напярэдадні свята ў мяне прайшлі дыялогавыя пляцоўкі, сустрэчы з моладдзю, у тым ліку з навучэнцамі Барысаўскага медыцынскага каледжа. На ўсіх мерапрыемствах ішла адкрытая размова аб нашым сённяшнім жыцці, планах на будучыню.

Беларускі народ — працалюбівы, творчы, добры, заўсёды адкрыты для дыялогу. Але сваё мы ніколі не аддадзім! Такая думка праходзіла лейтматывам у выступленні Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі.

Нас аб'ядноўваюць традыцыі, каштоўнасці, дружба, памяць аб нашых продках, дзякуючы якім мы жывём у прыгожай, незалежнай, самадастатковай краіне. Як падкрэсліў кіраўнік дзяржавы, калі б не было ўз'яднання Заходняй і Усходняй Беларусі, не было б у нас ні Дня Незалежнасці, ні Дня Перамогі. І нас бы не было, паколькі б не было той зямлі, дзе нарадзіліся нашы продкі. Гэтыя словы асабліва актуальныя сёння.

Мы нашчадкі тых, хто ў сорак першым адступаў, але не здаваўся, трымаўся за кожную пядзю сваёй зямлі, не шкадаваў свайго жыцця ў імя нашай будучыні, будучыні дзяцей.

Два мае дзяды прапалі без вестак у першыя дні вайны. Толькі два гады таму мы даведаліся, што адзін мой дзядуля Канстанцін Сасноўскі пахаваны пад Ржэвам у брацкай магіле. Мая маці нарадзілася на ваенным караблі, які стаяў на рэйдзе ў Чорным моры, і маракі аддалі бабулі анучы, каб можна было спавіць малую. Яны захавалі жыццё маёй маці, а яна дала жыццё мне — вырасла цэлае пакаленне Сасноўскіх.

Наша сям'я такая ж, як тысячы іншых, перанесла боль і пакуты Вялікай Айчыннай. Таму лічу, што асноўнымі напрамкамі ва ўмацаванні гістарычнай памяці павінны быць прызнанне і асуджэнне генацыду беларускага народа на міжнародным узроўні.

## МОЦ НАЦЫЯНАЛЬНАГА ДУХУ

**Тацццяна ПОЛУШКІНА, член Савета Рэспублікі, дырэктар Полацкага каледжа Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава:**



— 17 верасня яшчэ раз нагадвае кожнаму, што беларускі народ жыве ў міры, згодзе і ўзаемапавазе толькі дзякуючы яднанню. Разам мы перамаглі нялёгкія эканамічныя і палітычныя перашкоды, толькі моц агульнага духу і стойкасць нашых продкаў далі нам сёння права на незалежнасць і самастойнасць як краіне, так і нацыі. Беларуская зямля нарадзіла і выхавала выдатных дзеячаў культуры і навукі, медыцыны і новых тэхналогій. Кожны спецыяліст у сваёй галіне аддана працай фарміруе вобраз моцнай і развітой дзяржавы: аграрыі, што на высокім узроўні забяспечваюць харчовую бяспеку; педагогі, якія рыхтуюць будучых навукоўцаў; урачы, якія ўдасканальваюць метады лячэння. Гатовыя працягнуць руку дапамогі, гасцінныя і шчырыя — гэта мы, беларусы.

Дзень народнага адзінства — зусім маладое, але важнае для кожнага з нас свята. Патрыятычны форум «Гэта НАША гісторыя» з удзелам Прэзідэнта Беларусі пакінуў у мяне моцныя ўражанні. На «Мінск-Арэне» ўвечары 17 верасня, дзе сабраліся тысячы нераўнадушных да лёсу народа і дзяржавы людзей, як ніколі адчувалася моц нацыянальнага духу. Такое бывае на Дзень Перамогі і Дзень Незалежнасці — галоўныя для нас святы. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў адзін строй з гэтымі датамі не проста так устаў Дзень народнага адзінства, бо дзень, калі ў верасні 1939-га аб'ядналіся беларускія землі, сапраўды ў многім вызначыў вынік Вялікай Айчыннай вайны і нашу сучаснасць.

Чаму мы сёння прытрымліваемся міралюбівай палітыкі? Чаму не дазваляем, як у мінулыя стагоддзі, выкарыстоўваць нашы землі як арэну баявых дзеянняў і барацьбы інтарэсаў іншых краін? Таму што бераж нашу гістарычную памяць — гэта цячэ ў нашай крыві, у крыві нашчадкаў пераможцаў. Невыпадкова ў сваім выступленні Аляксандр Рыгоравіч адзначыў, што «беларусы ў саюзе з іншымі савецкімі народамі не толькі перамаглі, але і, адкінуўшы ранейшыя крыўды, у 1945-м вызвалілі Польшчу ад фашызму». Мы заўсёды жылі ў міры і згодзе з суседзямі, падстаўлялі плячо ў складаных момантах, і нашы геройчныя продкі ахвяравалі жыццём дзеля брацкіх народаў — толькі на польскіх землях засталося звыш 600 тысяч савецкіх воінаў. І мы ніколі не дазволім зносіць помнікі вызваліцелям і таптаць мемарыялы, як апошнім часам здараецца ў краінах так званага калектыўнага Захаду.

Мы помнім, якой цаной заваяваны мір, гэты гістарычны ўрок замацаваўся ў свядомасці кожнага беларуса. Патрыятызм, народнае адзінства і недапушчальнасць памылак мінулага — тры кіты, на якіх стаіць наша незалежная дзяржава. Мы ніколі не прэтэндавалі на чужое, беларусы змагаліся за сваё: мову, тэрыторыю, права на самавызначэнне. Зараз, калі свет літаральна трашчыць па швах, гэтыя паняцці з'яўляюцца для нас адным з найвялікшых багаццяў.

Кіраўнік дзяржавы вывеў мудрасць жыцця нашай нацыі, якая доўгія стагоддзі фарміравалася пад уплывам палітычных і эканамічных выпрабаванняў: «ні перад кім не кланяцца, жыць сваім розумам і са свайго мазаля» — гэта не проста высакамоўнае выказванне, а горкі вопыт, доўгая барацьба і высокія дасягненні сучаснасці. І тое, што мы маем зараз, будзем берагчы і ахоўваць як найвялікшы народны скарб.

## ТРАДЫЦЫЯ — БЫЦЬ ПАТРЫЁТАМІ

**Кацярына СЕРАФІНОВІЧ, член Савета Рэспублікі, намеснік дырэктара дзяржаўнай установы «Рэдакцыя «ЛідаМедыяКампанія»:**



— Сёння Беларусь — незалежная, суверэнная краіна. Беларускі народ ведаюць у свеце як народ, унікальны сваёй адукаванасцю, культурай выхавання, уменнем і жаданнем працаваць.

Але сёння набіраюць моц разбуральныя для цывілізацыі ўсёй планеты працэсы. Устанаўленне новага глабальнага светаўладкавання не пройдзе бяскроўна, непрыкметна. Тым больш для нас — краіны, якая знаходзіцца на перакрыжаванні геапалітычных інтарэсаў. Пра гэта казаў у сваёй прамове на Дзень народнага адзінства Прэзідэнт нашай краіны Аляксандр Лукашэнка: «Гэта значыць, тут, на гэтай нашай святой беларускай зямлі, калі глядзець у гісторыю, ды і будучыню — я гэта бачу, — эпіцэнтр усіх падзей. Тут заўсёды тварылася гэта каша, тут заўсёды сутыкаліся інтарэсы найбуйнейшых дзяржаў. І мы часам аказваліся ў сітуацыі не сваіх дзеянняў і не сваёй вайны. Тут ішлі разборкі буйных сусветных гульцоў».

Лідар нашай краіны дае дакладную карціну сітуацыі, якая існуе на сёння, а яна, мякка кажучы, не вельмі радасная. Але разам з тым у прамове Аляксандра Лукашэнкі ёсць і «рэцэпт», што трэба рабіць, каб не трапіць, як кажуць, «у замес». «І ўрок адзін. Нас не будуць піхаць то ўлева, то ўправа, калі мы будзем жыць на сваёй зямлі, будзем яе цаніць, нікому не аддаваць, будзем свята захоўваць свой суверэнітэт над гэтай тэрыторыяй». Яшчэ адна красамоўная цытата: «У нашых сілах сёння зрабіць высновы з падзей мінулага, каб устаяць і захаваць сябе як суверэнную дзяржаву».

Амаль дваццаць гадоў беларускі народ быў раз'яднаны: па ўмове Рыжскага дагавора ў 1921 годзе землі Заходняй Беларусі адышлі да Польшчы. Што спазнала беларускае насельніцтва за час знаходжання ў складзе іншай дзяржавы — увогуле тэма для асобнай размовы. Зазначу адно: на пачатак новага навучальнага года ў 1938—1939 гадах у Заходняй Беларусі не засталося ніводнай беларускай школы. Больш за 100 тысяч беларускіх дзяцей не наведвалі ўвогуле ніякай школы. Адукаваныя людзі з ліку беларусаў «міласцівай» Польшчы не былі патрэбны.

Ёсць у беларусаў добрая нацыянальная традыцыя: нягледзячы ні на што, заставацца добразычлівымі, лагоднымі, улюбёнымі ў сваю краіну — сапраўднымі патрыётамі Беларусі. Гэта дае надзею выстаяць у ліхаманкава зменлівым свеце. У тым, што так будзе, ёсць упэўненасць. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: «Калі таді, 100 гадоў назад, у пачатку ХХ стагоддзя, маладая беларуская рэспубліка не мела сіл сябе абараніць, то сёння абарону нашых спрадвечных нацыянальных межаў мы не проста абаронім — утрымаем. Утрымаем таму, што ў нашых жылах цячэ кроў пераможцаў, таму што ў нас моцная ўлада, моцная адзіная нацыя. Таму што мы проста хочам жыць на сваёй зямлі, сваім розумам, гадаваць сваіх дзяцей». І такі стан вельмі важна захаваць і надалей.

Сёлета Дзень народнага адзінства мы адсвяткавалі другі раз. Я ўпэўнена: у нашай краіне гэты дзень, як сімвал адзінства народа, будзе святкавацца штогод і надалей. Яшчэ нямала будзе раскрыта новых старонак, звязаных з тымі гістарычнымі падзеямі. Напрыклад, наша «Лідская газета» зараз рыхтуе святочны нумар да 83-й гадавіны нашага выдання. Сярод матэрыялаў ёсць і архіўныя звесткі, якія сведчаць пра тое, што ў 1939 годзе лідчане з вялікай радасцю і патрыятычным уздымам сустракалі часці Чырвонай Арміі, якія першымі прынеслі вестку пра вызваленне Заходняй Беларусі і далучэнне яе да Усходняй. Засталіся ўспаміны відавочцаў пра тое, як у Лідзе, іншых населеных пунктах нашага раёна людзі ўстанаўлівалі трыумфальныя аркі для сустрэчы воінаў-вызваліцеляў.

# АДЗІНСТВА

## ДЗЕЛЯ ІНТАРЭСАЎ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА І ДЗЯРЖАВЫ

**Алег ДЗЯЧЭНКА, член Савета Рэспублікі, рэктар Акадэміі паслядыпломнай адукацыі:**



— Я хацеў бы звярнуць увагу вось на які аспект выступлення кіраўніка нашай дзяржавы. На палітычнай авансцэне ў некаторых заходніх краінах найбольшы грамадскі рэзананс выклікала наданне дню 17 верасня статусу такога ж дзяржаўнага свята, як Дзень Перамогі і Дзень Незалежнасці. Прынятае рашэнне азадачыла тых нашых суседзяў, якія думаюць катэгорыямі вялікадзяржаўнага шавінізму і мараць аб новых раздзелах Беларусі, аб вяртанні да міжнароднай палітычнай сітуацыі 1921 або 1939 года. Прэзідэнт у сваім выступленні абнуліў гэтыя фантазіі і накіраваў пасыл усім, хто яшчэ не зразумеў або не жадае разумець, што Беларусь — суверэнная і незалежная дзяржава, якая абароніць сваю тэрытарыяльную цэласнасць усімі магчымымі сродкамі. «Мы жывём на сваёй зямлі, — падкрэсліў ён, звяртаючыся да ўдзельнікаў форуму. — Гэта наша зямля з тых даўніх часоў. Гэта непахісна, і мы гэтую зямлю нікому не аддадзім».

Таму адной з найбліжэйшых палітычных задач павінна стаць рэальная нацыянальная кансалідацыя ўсіх патрыятычных сіл нашай краіны перад выклікам новых геапалітычных пагроз. Так гістарычна склалася, што беларускія землі неаднаразова станавіліся арэнай сутыкнення геапалітычных інтарэсаў і ваенная супрацьстаяння вядучых дзяржаў свету. І ўсе гэтыя знешнепалітычныя авантуры прыносілі беларускаму народу толькі гора і пакуты, эканамічную разруху і тэрытарыяльныя страты. У сувязі з гэтым Прэзідэнт наўпрост звярнуўся да суайчыннікаў з заклікам аб'яднацца, пераадолець палітычныя рознагалоссі і, адкінуўшы ўсё «асабістае ўбок», адзіным фронтам выступіць у абароне інтарэсаў беларускага народа і дзяржавы.

Не пакінуў кіраўнік дзяржавы без увагі і стварэнне ў адной з сумежных краін дыверсійных банд для захопу ўлады ў Беларусі неканстытуцыйным шляхам, за якімі стаяць прадстаўнікі замежных ваенных арганізацый. Гэтыя ўзброеныя групоўкі навучаны вядзенню тактыкі партызанскай вайны і складаюцца з апазіцыянераў і «збеглых», якія даўно ўжо скаціліся ў адно балота з ашалелымі міжнароднымі палітыкамі, якія выступаюць супраць існавання незалежнай і суверэннай Беларусі. Гэты прыклад быў адрасаваны ўсім беларусам як напамін, што сёння нельга губляць пільнасць. Па перыметры нашай краіны палаюць канфлікты, паднімае галаву неаімперыялізм. Вядучыя дзяржавы планеты зноў бразгаюць зброяй і гатовы да развязвання войнаў. Мір і бяспека дорага каштуюць, менавіта таму беларусам неабходна сёння пачуць патрыятычны заклік Прэзідэнта і аб'ядначца, паколькі ў народным адзінстве і сіла, і праўда.

**Фота з архіва Алега ДЗЯЧЭНКІ.**

## НАША ЗАДАЧА — НЕ ЗАБЫВАЦЬ АБ СВАІМ ПАХОДЖАННІ, АБ ВЯЛІКАЙ ГІСТОРЫІ

**Аляксей НЯВЕРАЎ, член Савета Рэспублікі, старшыня Гомельскага абласнога аб'яднання арганізацый прафсаюзаў:**



— У Дзень народнага адзінства, калі гістарычна ўз'ядналася наша нацыя, мы нагадваем сабе аб тым, як павінен паводзіць сябе народ перад тварам бяды і небяспекі, як трэба шанаваць уласную культуру, не паддавацца іншаму ўплыву, не апускаць рукі. І ў гэтым ёсць глыбокі сэнс галоўных жыццёвых каштоўнасцяў беларусаў: жыць у міры і згодзе, ствараць на карысць сённяшняга дня і на стагоддзі, любіць, гадаваць дзяцей, рэалізоўваць свае таленты. Захоўваць памяць аб Радзіме, уносіць пасільны ўклад у яе развіццё, прытрымліваецца традыцый продкаў, старацца быць дастойнымі нашчадкамі — усё гэта залог мірнага неба над галавой.

## ЖЫЦЬ СВАІМ РОЗУМАМ І СА СВАЙГО МАЗАЛЯ

**Анатоль ШАЛТАНЮК, член Савета Рэспублікі, старшыня Жабінкаўскага раённага Савета:**

— У выхадныя ўся наша краіна адсвяткавала Дзень народнага адзінства. З асаблівай увагай мы слухалі выступленне Прэзідэнта на патрыятычным форуме «Гэта НАША гісторыя».

Кіраўнік дзяржавы правёў падрабязны экскурс у гісторыю, спыніўся на падзеях 1939 года, не абышоў увагай нашу ролю ў Вялікай Перамозе, абмаляваў цяперашнюю складаную палітычную сітуацыю ў свеце. Аляксандр Лукашэнка адзначыў наша несумненнае дасягненне, што людзі жывуць ціхім спакойным жыццём, гадуюць дзяцей, вырошчваюць хлеб, нацэлены ў будучыню: «А калі нас падзялілі па-жывому, быў такі замес у гісторыі і каша на тэрыторыі Беларусі, што не толькі гісторыкам, але і многім іншым — палітолагам, юрыстам, дзяржаўным дзеячам — давядзецца разбірацца. Нязменна адно — мы жывём на сваёй зямлі. Гэта наша зямля з даўніх часоў. Гэта непарушна. І мы гэтую зямлю нікому не аддадзім», — сказаў Прэзідэнт, і гэтыя словы, як выглядае, выклікалі не толькі шквал апладысментаў, але знайшлі водгук у кожным сэрцы. Як і іншыя, сказаныя на роднай мове ад усёй душы:

— Мы вякамі жывём на гэтай Богам прызначанай нам зямлі. Мы не жадаем чужога і ніколі не жадалі. Веліч і годнасць нашых продкаў заўсёды абуджаліся перад любымі пагрозамі і ніколі не будаваліся на прыніжэнні суседзяў. Як я казаў, суседзі ад Бога, іх не выбіраюць. Мудрасць жыцця, якая перадаецца з пакалення ў пакаленне, — ні перад кім не кланяцца, жыць сваім розумам і са свайго мазаля. У Дзень народнага адзінства мы ўпэўнена кажам, што спрадвечная мара беларусаў спраўдзілася.

Падчас урачыстага адкрыцця моста па вуліцы Міру, у цэнтры — Анатоль ШАЛТАНЮК.



Гэта сапраўды па-нашаму: жыць сваім розумам і са свайго мазаля, а яшчэ жыць у спакойнай краіне, працаваць на карысць нашых гарадоў і вёсак. У сваім невялікім горадзе-спадарожніку Брэста мы асабліва гэта адчуваем. Жабінка апошнім часам стала актыўна развівацца. Літаральна за два апошнія тыдні ў райцэнтры адкрылася некалькі патрэбных і знакавых аб'ектаў. Напрыклад, восьмага верасня мы віншавалі выхаванцаў і іх бацькоў з адкрыццём новага дзіцячага садка на 240 месцаў. Дашкольная ўстанова размясцілася ў паўночна-ўсходняй частцы горада. Узвялі аб'ект нават менш чым за паўтара года. Фінансавалі будоўлю абласны і раённы бюджэты. Садок атрымаўся прыгожы, светлы, прасторны на радасць бацькам і дзецям. Будынак зрабілі рознаўзроўневым: двух- і трохпавярховым. Ёсць добра аснашчаныя музычная і спартыўная залы, а таксама камп'ютарна-гульнявы пакой, абсталяваны класы для заняткаў у гуртках — адным словам, прадугледжана ўсё, каб дзеці адчувалі сябе камфортна і гарманічна развіваліся.

Тэрыторыя садка максімальна добраўпарадкавана і ўладкавана. Ёсць гульнявыя і спартыўныя пляцоўкі. Паставілі нават спецыяльны бокс, дзе бацькі могуць на дзень пакідаць веласіпеды, каляскі, зімой — санкі. У садок ужо прынялі больш за 200 дзяцей. Бацькі выказвалі вялікую падзяку за тое, што дашкольная ўстанова з'явілася ў крокавай даступнасці. Нядаўна здадзены першы дзевяціпавярховік, побач жа будуецца новы мікрараён, дзе будуць жыць у тым ліку і брастаўчане. Некаторыя з іх ужо падалі заявы на прыём іх дзяцей у садок.

А літаральна напярэдадні свята, 16 верасня, у райцэнтры адкрылі пасля рэканструкцыі мост. Гэты пуцепровад знаходзіцца па вуліцы Міру, размешчаны побач з камбікормавым заводам. Раней эксперты абследавалі мост і прыйшлі да высновы, што стан яго аварыйны і патрабуе рэканструкцыі. Будаўнікі разабралі старое збудаванне і фактычна ўзвялі новы мост даўжынёй 27 метраў. Мост па вуліцы з сімвалічнай назвай — Міру — азначае, несумненна, паляпшэнне якасці жыцця кожнага гараджаніна. Наш горад невялікі, кампактны, і любая транспартная артэрыя мае вялікае значэнне. Новы мост выглядае сучасна, стыльна, па ім прыемна праязджаць. Тым больш што будаўнікі адначасова добраўпарадкавалі тэрыторыю размешчанага паблізу помніка ахвярам Вялікай Айчыннай вайны.

**Фота БелТА.**

**Меркаванні членаў Савета Рэспублікі запісалі Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, Нэлі ЗІГУЛЯ, Арына КАРПОВІЧ, Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ, Маргарыта УШКЕВІЧ, Святлана ЯСКЕВІЧ.**

РЭХА ПАДЗЕІ

## 21 ГРАНЬ ЯДНАННЯ

**Напярэдадні Дня народнага адзінства Віцебск прыняў эстафету абласнога патрыятычнага марафону «Адзіны», які з 1 да 17 верасня прайшоў у 21-м раёне паўночнага рэгіёна.**



Акцыя стартавала ў Пастаўскім раёне. Удзельнікі марафону на працягу 17 дзён перадавалі з раёна ў раён сцяг Рэспублікі Беларусь, а яшчэ — ручнікі з адметным для пэўнага раёна арнаментам.

Напярэдадні Дня народнага адзінства, які ў паўночным рэгіёне адсвяткавалі разам з абласным фестывалем-кірмашом працаўнікоў вёскі «Дажынкі-2022», Віцебск прыняў сцяг і ручнік ад Віцебскага раёна. Дарэчы, пачэсная права перадаць дзяржаўны сімвал былі ўдастоены людзі розных прафесій, якія дасягнулі поспехаў у сваёй галіне. Прадстаўнік Віцебскага раёна Дзмітрый Іваноў — яркая постаць у аграрнай сферы не толькі мясцовага, але і абласнога маштабу. Сёлета малады вадзіцель агракомплексу «Янавічы» ААТ «Віцебская бройлерная птушкафабрыка» першым на Віцебшчыне перавёз звыш пяці тысяч тон зерня, высокія вынікі на ўборачнай Дзмітрый Уладзіміравіч паказвае штогод, але падчас леташняга жніва ён устанавіў асабісты рэкорд. Сімвалічна, што напярэдадні галоўнага свята аграрыяў менавіта Іваноў перадаў патрыятычную эстафету гораду, бо хлеб і сельская гаспадарка з'яўляюцца галоўнай аб'яднаўчай сілай. Прыняў сцяг першы сакратар гарадскога камітэта ГА «БРСМ» Артур Віталь. Перадфінальныя акорды абласнога марафону «Адзіны» адгучалі на пляцоўцы Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта.

«Сёння народнае адзінства — гэта незалежнасць нашай краіны, магчымасць рэалізаваць свае планы і быць карысным для грамадства. Прыемна бачыць, што моладзь з'яўляецца ініцыятарам такога марафону і прымае ў ім актыўны ўдзел па ўсёй вобласці. Маючы сёння такі перспектыўны рэзерв, які сфарміраваны на Віцебшчыне, можна смела гаварыць аб светлай будучыні, бо вы жадаеце і можаце зрабіць нашу Беларусь лепшай», — адзначыў у віншавальным слове **старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар ЛІСКОВІЧ.**

У сонечны перадсвяточны дзень на пляцоўцы ВДМУ было ажыўлена: прысутнічалі ганаровыя госці, кіраўніцтва горада, актыў паўночнага рэгіёна, прадстаўнікі арганізацый, студэнты. Але больш за ўсіх прыцягвалі ўвагу дзяўчаты-красуні — жаноцкае ўвасабленне кожнага раёна вобласці, якія трымалі на руках рэгіянальныя ручнікі. Іх перадалі актывістам саюза моладзі, а яны прывезлі сімвалы патрыятычнай эстафеты ў горад Глыбокае, які сёлета быў сталіцай абласных Дажынак.

«Незалежнасць нашай дзяржавы дасталася нам нялёгка, і толькі ў адзінстве мы можам захаваць свой суверэнітэт і высокія дасягненні ў розных сферах. Свята 17 верасня не толькі пра адзінства нас, беларусаў, але і пра ўзаемапавагу і паразуменне з усімі народамі свету, якія пражываюць у Беларусі. Няхай над нашай краінай заўсёды будзе мір!» — заключыў **старшыня Віцебскага гарадскога Савета дэпутатаў Уладзімір БЯЛЕВІЧ.**

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, фота аўтара.**

# БЕШАНКОВІЧЫ ПАВІННЫ СТАЦЬ ПРЫГАРАДАМ ВІЦЕБСКА

## Гэтую думку старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА выказала на сустрэчы з актывам Бешанковіцкага раёна

**На дыялог са старшынёй верхняй палаты парламента сабраліся прадстаўнікі райвыканкама, мясцовага самакіравання, арганізацый і прадпрыемстваў раёна. Падчас размовы былі абмеркаваны пытанні павышэння ўзроўню жыцця і перспектывы гарадскога пасёлка.**

Бешанковічы знаходзяцца за 50 кіламетраў ад абласнога цэнтра. Для таго, каб насельніцтва не выязджала ў горад на работу, важна стварыць прадпрыемствы і забяспечыць людзей працоўнымі месцамі. Тым больш што ў раёна вялікі патэнцыял, але ўсё роўна ёсць куды расці: прамысловы комплекс складаюць шэсць прадпрыемстваў. Кіраўніцтву раёна неабходна палепшыць сацыяльную інфраструктуру: пабудаваць спарткомплекс, басейн, месцы адпачынку і забяспечыць якаснае медыцынскае абслугоўванне — умовы для таго, каб на належным узроўні адпавядаць запытам жыхароў любога ўзросту. Наталля Іванаўна засяродзіла ўвагу і на развіцці турызму, якому спрыяе жывапісная прырода і багатыя лясы.

Старшыня Савета Рэспублікі спыніла ўвагу ўдзельнікаў сустрэчы на пытанні дэмаграфіі і традыцыйных сямейных каштоўнасцяў. Дзяржава падтрымлівае сем'і, ставарае неабходныя ўмовы для выхавання, навучання і развіцця падрастаючага пакалення, таму бацькі могуць быць заспакоены. Кожны малады спецыяліст, які прыедзе ў раён, павінен быць падтрыманы прадпрыемствам матэрыяльна: забяспечаны жыллём, згодна са сваёй спецыяльнасцю і прафесійным узроўнем атрымліваць добрую зарплату. Тады чалавек не захоча ехаць у сталіцу ці другі абласны цэнтр у пошуках лепшага жыцця, а ўкараніцца тут, завядзе сям'ю і народзіць дзяцей. Усё пачынаецца з малога.


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Наталля Іванаўна расказала аб значнасці органаў мясцовага кіравання, прадпрыемстваў і арганізацый раёна. «Вы працуеце на месцах, побач са сваімі сябрамі, суседзямі. І каму, як не вам, ведаць лепш пра тое, што турбуе насельніцтва? Слухайце, дапамагайце людзям. Як паказвае практыка, многія пытанні можна вырашыць на ўзроўні сельскага Савета або райвыканкама без зваротаў у вышэйшыя органы. Кожны на працоўным месцы павінен якасна выконваць сваю работу і ствараць надзейную заслону для падрастаючага пакалення. Мы ў адказе за будучыню краіны — нашых дзяцей».

Старшыня Савета Рэспублікі паразмаўляла з кіраўнікамі прадпрыемстваў, устаноў адукацыі і аховы здароўя ў фармацэ адкрытага дыялогу. Прысутныя на сустрэчы расказалі аб тэмах, якія іх цікавяць, і выказалі пажаданні па развіцці роднага раёна.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

ІНІЦЫЯТЫВА

# ГІСТОРЫЯ НА КОЛАХ

## На што здольны маладзёжны парламент раённага маштабу

**Напярэдадні Дня народнага адзінства ў Крычаўскім гістарычным музеі прэзентавалі адзін з найлепшых праектаў першага рэспубліканскага конкурсу маладзёжных ініцыятыў. Гэты праект трапіў у лік 18 найлепшых ініцыятыў з усёй краіны. У Год гістарычнай памяці крычаўскія актывісты ад моладзі вырашылі стварыць перасовачную выставу пра ваеннае мінулае свайго раёна. Атрымаўся грунтоўны праект, які ахоплівае ўсе перыяды ваеннага ліхалецця: абарончыя баі ў ліпені 1941 года, час акупацыйнага рэжыму і гераічнае вызваленне Крычаўшчыны.**


Фота Таццяны ПАДЛІПСКАЙ.

— Гэта была ініцыятыва маладзёжнага парламента пры раённым Савеце дэпутатаў, падрыхтаваная разам з гістарычным музеем Крычава, — расказвае **дырэктар музея і старшыня маладзёжнага парламента пры Крычаўскім райсавеце дэпутатаў Уладзімір МІШЧАНКА**. — Выстава, якая адкрылася ў музеі на мінулым тыдні, выклікала жывую цікавасць. У апошні дзень верасня, калі Крычаў будзе святкаваць свой дзень нараджэння, жыхары і госці горада змогуць убачыць яе ў гарадскім парку Перамогі. Потым яна аб'едзе ўсе арганізацыі, установы і прадпрыемствы раёна.

У выставе прадстаўлена вялікая колькасць дакументаў, карт і фотаздымкаў, якія расказваюць пра ваенны перыяд жыцця раёна.

— У нас у музеі ёсць экспазіцыя, прысвечаная Вялікай Айчыннай вайне, але мы не маем магчымасці вывезці яе на раённыя мерапрыемствы, — удакладняе **навуковы супрацоўнік музея і намеснік старшыні раённага маладзёжнага парламента Анастасія РАДОЎСКАЯ**. — Ідэя зрабіць перасовачны аналаг лунала ў паветры, і калі аб'явілі І Рэспубліканскі конкурс маладзёжных ініцыятыў, адразу ж падумалі: чаму б яе не рэалізаваць? Напісалі праект і перамаглі! На рэалізацыю ініцыятывы атрымалі пяць тысяч беларускіх рублёў.

Экспазіцыя ўяўляе 10 інфармацыйных стэндаў у чалавечы рост, дзе размешчаны копіі дакументаў з фондаў музея плюс копіі дакументаў пра новыя злачынствы супраць насельніцтва, якія сталі вядомыя ў ходзе расследаванняў раённай пракуратуры. Дададася таксама інфармацыя па чалавечых стратах з занальнага архіва. На сёння гэта самая поўная інфармацыя пра ваенныя падзеі ў Крычаўскім раёне. Яшчэ падрыхтавана пяць рол-апаў з інфармацыяй па памятных знаках, патрыятычных мерапрыемствах, якія адбываюцца ў раёне з удзелам моладзі.

У падрыхтоўцы праекта былі задзейнічаны актывісты БРСМ і райсавет дэпутатаў. Апошні ўсяляк прасоўвае маладзёжныя праекты і ідэі. Дарэчы, у активе мясцовых пачынаючых дэпутатаў гэта не адзіны важны праект. Ёсць нават міжнародны — «Дарогамі Пацёмкіна: па памятных мясцінах князя-стваральніка». Удзел у яго распрацоўцы прымала і расійская моладзь са смаленскай асацыяцыі «Агенцтва інтэграцыйных ініцыятыў». Адной з частак праекта стаў гістарычны квэст на тэму малой радзімы расійскага князя, які праходзіў у Смаленскай вобласці. А ўжо ў крычаўскім музеі, які, як вядома, знаходзіцца ў палацы Пацёмкіна, падводзілі разам з расійскімі сябрамі вынікі гэтага вялікага турыстычнага праекта і прэзентавалі віртуальную экспазіцыю, прысвечаную жыццю і спадчыне дзяржаўнага дзеяча.

У раённым Савеце дэпутатаў адзначаюць, што крычаўскі маладзёжны парламент працуе на поўную моц. Нездарма сюды едуць па вопыт з іншых раёнаў. І спадзяюцца, што сёлетні патрыятычны праект крычаўскай моладзі стане адным з узорных у маштабах не толькі вобласці.

— Знамянальна, што ён быў адзначаны з 500 заявак, якія былі пададзены на конкурс, — падкрэсліла **старшыня Крычаўскага раённага Савета дэпутатаў Ірына ПРУДНІКАВА**. — Нашы стваральнікі ўвайшлі ў лік 18 пераможцаў. Наогул, па Магілёўскай вобласці перамагло толькі чатыры праекты. Асабліва каштоўна, што гэты «ваенны летапіс» пісалі маладыя людзі і для моладзі. Дзеля таго, каб памяць жыла, каб будучыя пакаленні не забываліся пра гістарычную праўду вайны.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРНЫХ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15
ад 17 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.**

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 20 верасня 2022 года.

## ПЕРВИЧНАЯ ПРОФСОЮЗНАЯ ОРГАНИЗАЦИЯ ОАО «БЕЛАРУСЬКАЛИЙ»

БЕЛОРУССКОГО НЕЗАВИСИМОГО ПРОФСОЮЗА ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА.

**Дата и время проведения торгов – 25 октября 2022 года в 12.00.**
**Место проведения торгов: Минская область, город Солигорск, улица Богомолова, 13А-5.**

Форма проведения торгов – открытый аукцион.
Продавец (организатор торгов):
первичная профсоюзная организации открытого акционерного общества «Беларуськалий» Белорусского Независимого профсоюза горняков, химиков, нефтепереработчиков, энергетиков, транспортников, строителей и других работников (далее – ППО ОАО «Беларуськалий» БНП).
Минская область, город Солигорск, улица Богомолова, 13А-5,
8 025 740 66 51/ 8 029 37 11 028

Сведения о предмете торгов:

### ИЗОЛИРОВАННОЕ ПОМЕЩЕНИЕ (АДМИНИСТРАТИВНОЕ ПОМЕЩЕНИЕ) с инвентарными номером 644/D-47177, площадь 84,7 кв. м.

Имущественные права в отношении изолированного помещения: право собственности, правообладатель – юридическое лицо, резидент Республики Беларусь ППО ОАО «Беларуськалий» БНП. Ограничения (обременения) прав: отсутствуют. Место нахождения: Минская область, город Солигорск, улица Богомолова, 13А-5. Информация о земельном участке (при его наличии) для обслуживания продаваемого недвижимого имущества (вид вещного права на земельный участок, площадь, а также срок его аренды в случае продажи права заключения договора аренды земельного участка): право собственности Республика Беларусь, право постоянного пользования, правообладатель – юридическое лицо, резидент Республики Беларусь – Представительство Национального олимпийского комитета Республики Беларусь в Минской области. Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по тел. 8 025 740 66 51 / 8 029 37 11 028.

**Начальная цена предмета торгов – 167 332, 44 (сто шестьдесят семь тысяч триста тридцать два белорусских рубля 44 копейки). Шаг аукциона – 5 % (пять процентов).**

**Размер задатка для участия в торгах – 16 733, 25 руб.** (шестнадцать тысяч семьсот тридцать три белорусских рублей 25 копеек) путем внесения на расчетный счет ППО ОАО «Беларуськалий» БНП: BY44AKBB30150087000156600000, ОАО «Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, код 969, УНН 600392762 (перечисляется до подачи заявления).

Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 22 сентября 2022 г.** по почте на адрес: Минская обл., г. Солигорск, ул. Богомолова, 13А-5, 223709.

Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается **22 октября 2022 г. в 16.00** включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения.

Лицо, желающее участвовать в торгах, обязано подать организатору торгов в указанный в извещении срок заявление на участие в торгах, документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка. Кроме того, представляются следующие документы:

юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь – копии устава (учредительного договора – для коммерческой организации, действующей только на основании учредительного договора), имеющего штамп, свидетельствующий о проведении государственной регистрации, и свидетельства о государственной регистрации и их подлинники для заверения копий организатором аукциона, доверенность представителю юридического лица (если юридическое лицо представляет не руководитель) или документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор либо иные документы в соответствии с законодательством);

юридическим лицом, иной организацией – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до даты подачи заявления) или иное равнозначное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык, легализованная в установленном порядке доверенность представителю юридического лица, иной организации или другие легализованные в установленном порядке документы с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык;

индивидуальным предпринимателем – резидентом Республики Беларусь – копия свидетельства о государственной регистрации и подлинник для заверения копии организатором аукциона;

индивидуальным предпринимателем – нерезидентом Республики Беларусь – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык;

представителем гражданина Республики Беларусь, индивидуального предпринимателя – резидента Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем иностранного физического лица, индивидуального предпринимателя – нерезидента Республики Беларусь – легализованная в установленном порядке доверенность с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в торгах физическое лицо, индивидуальный предприниматель, представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица, иной организации предъявляют оригинал документа, удостоверяющего личность, и представляют его копию, которая заверяется организатором торгов.

Сведения об участниках торгов являются конфиденциальной информацией.

Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этом случае сумма внесенного задатка возвращается ему организатором торгов в течение пяти дней со дня проведения торгов.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.

Порядок оформления результатов торгов: в день проведения торгов участник, выигравший торги, и все присутствующие члены комиссии подписывают протокол о результатах торгов в двух экземплярах. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: произвести оплату услуг за организацию и проведение торгов, в том числе затраты за публикацию в газете «Звязда» и других источниках глобальной сети Интернет в течение 3 (трех) рабочих дней с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение 10 календарных дней.

Срок подписания договора в течение 10 календарных дней с момента проведения торгов. Срок оплаты приобретенного предмета торгов: в день подписания договора купли-продажи объекта торгов.

Проводится аукцион в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (ред. от 25.03.2022) «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица» (вместе с «Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов»)

---

## ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов в дер. Черниковщина, дер. Мостище Заболотского сельсовета Смолевичского района Минской области**

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Форма проведения аукциона | Открытый |
| 2 | Дата, время и место проведения аукциона | **27 октября 2022 года, в 11.00, аг. Заболотье, ул. Купрейчика, 1А, Заболотский сельисполком, кабинет председателя** |
| 3 | Продавец и его адрес | Заболотский сельский исполнительный комитет, 222223, аг. Заболотье, ул. Купрейчика, д. 1А |
| 4 | Земельный участок, его кадастровый номер и адрес | Лот № 1 – площадь 0,1500 га, № 624882007101000428, дер. Черниковщина, объект № 65/2020<br>Лот № 2 – площадь 0,1500 га, № 624882003601000236, дер. Мостище, ул. Тихая, участок № 1<br>Лот № 3 – площадь 0,1483 га, № 624882003601000237, дер. Мостище, ул. Тихая, участок № 2 |
| 5 | Условия продажи | Без изменения целевого назначения |
| 6 | Целевое назначение земельного участка | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома |
| 7 | Начальная (стартовая) цена продажи | Лот № 1 – 20000 рублей<br>Лот № 2 – 15000 рублей<br>Лот № 3 – 15000 рублей |
| 8 | Условия аукциона | а) продажа по цене не ниже начальной;<br>б) участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории Республики Беларусь<br>в) **без права предоставления рассрочки**;<br>г) возместить затраты на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельному участку, в порядке и случаях, предусмотренных постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 01.04.2014 г. № 298.<br>д) при подаче заявления на определенный лот только одним участником, земельный участок продается по начальной цене, увеличенной на 5 %;<br>е) наличие не менее двух участников;<br>ж) получить в установленном порядке техническую документацию и разрешение на строительство одноквартирного жилого дома; приступить к занятию (освоению) земельного участка в течение одного года со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения прав на него |
| 9 | Наличие инженерной инфраструктуры | дер. Черниковщина – имеется возможность подключения объекта строительства к сетям электроснабжения;<br>дер. Мостище – имеется возможность подключения объекта строительства к сетям электроснабжения, газоснабжения |
| 10 | Условия оплаты | За безналичный расчет в течение 10 рабочих дней после подписания протокола по результатам проведения аукциона |
| 11 | Сумма задатка и реквизиты продавца | 10 % от начальной (стартовой) цены земельного участка, получатель Заболотский сельисполком, р/с BY86AKBB36410000007286200000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Смолевичи, БИК AKBBBY2X, УНН 600023902, код платежа 90101 |
| 12 | Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемыми земельными участками | Каждую среду в 12.00 |
| 13 | Дата начала приема документов | **С 27 сентября 2022 года в рабочие дни ежедневно** |
| 14 | Окончательный срок приема документов | **21 октября 2022 года в 17.30** |
| 15 | Контактные телефоны | 8-01776-44-7-38, 44-2-16 |

Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после утверждения результатов аукциона внести плату за земельный участок, а также возместить расходы, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона: лот № 1 – 2269,94 руб.; лот № 2 – 2141,54 руб., лот № 3 – 2527,96 руб. (указаны затраты без учета стоимости информационного сообщения).

**Примечания: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо представить:**

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Копии платежных поручений, заверенные банком, подтверждающие внесение задатка на расчетный счет продавца.
3. Физическим лицам – документ, удостоверяющий личность (паспорт и его копия) покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально (в случае если интересы покупателя представляет это лицо).

---

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

### ИЗВЕЩАЕТ ОБ АУКЦИОНЕ

**ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 400/С-1914 (назначение – здание блокированного жилого лома, наименование – жилой дом), площадью 349,0 кв. м, расположенное по адресу: Гродненский р-н, Квасовский с/с, д. Литвинки, 8.**

ЛОТ 1 расположен на земельном участке с кадастровым номером 422084008601000043 (назначение – земельный участок для обслуживания многоквартирного жилого дома), площадью 0,2500 га по адресу: Гродненский р-н, Квасовский с/с, д. Литвинки, 8. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в водоохранных зонах рек и водоемов, код – 2.4, площадью 0,2500 га; земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, код – 5.2, площадью 0,0095 га.

Начальная цена продажи – 71 900 руб.
(семьдесят одна тысяча девятьсот рублей) с учетом НДС.
Сумма задатка – 7 190 (семь тысяч сто девяносто рублей)

Продавец – сельскохозяйственный производственный кооператив «Свислочь», 231704, Гродненский р-н, аг. Свислочь, ул. Парковая, 3, тел./факс 8-0152-912-100

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70

Условия аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 21 октября 2022 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion

**Заявления на участие принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18**

**Последний день приема заявлений – 19 октября 2022 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», https://grino.by/aukcion**

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «Слуцк-Модуль» (продавец) в процедуре ликвидации юридического лица, проводит повторный открытый аукцион**

### ПО ПРОДАЖЕ ОДНИМ ЛОТОМ ЗДАНИЯ СКЛАДА

**с инв. № 640/С-38242 общей площадью 2467,1 кв. м и ПЛОЩАДКИ АСФАЛЬТОБЕТОННОЙ (инв. № 98364) с инв. № 640/С-84443 общей площадью 1612,5 кв. м, расположенных на земельном участке с кадастровым номером 624650100001009966 *(право аренды по 10.12.2040)* площадью 0,7325 га по адресу: Минская область, г. Слуцк, ул. 14 Партизан, 101/18.**

Начальная цена с НДС (20 %) **– 544 644,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **54 464,00** бел. руб.
*Начальная цена снижена на 10 %.*

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, код платежа – 40901, код категории платежа OTHR, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации». Шаг аукциона – 5 процентов.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах регламентирован Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16, размещенным на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней после подписания договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (единственный участник, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) (покупатель).

Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 12.07.2022.

Аукцион состоится **06.10.2022** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **05.10.2022** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11.**
**Тел. для осмотра: 8 (044) 72 35 122.**

УНН 600074992

---

Общим собранием участников
**ООО «Маркетинговая Инновационная Группа»** (УНП 690705459)

ПРИНЯТО РЕШЕНИЕ О ДОСРОЧНОМ ПОГАШЕНИИ ЧАСТИ ОБЛИГАЦИЙ 4-го выпуска
(государственный регистрационный номер выпуска облигаций 6-236-02-2928) в количестве 300 шт.

Дата досрочного погашения – 27.09.2022.
Дата формирования реестра владельцев облигаций для целей досрочного погашения – 23.09.2022.

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА СЛОНИМСКОГО ГУП ЖКХ

| Предмет торгов | Начальная цена с учетом НДС, руб. | Сумма задатка (10 %), руб. |
|---|---|---|
| **Лот № 1 – комбайн «Полесье КЗС-1218-10»** в комплекте с жаткой для зерновых культур ЖЗК-7-2 (7м) и тележкой, 2011 г. в., заводской № 04885, регистрационный знак СК-4 7379, инвентарный № 7007000000601, изготовитель – ОАО «Гомсельмаш» | 22 080,00 | 2 208,00 |
| **Лот № 2 – косилка КМР-9,** 2014 г. в., заводской № 0074, инвентарный № 7007000000600, изготовитель – ОАО «Лидагропроммаш» | 23 880,00 | 2 388,00 |

**Местонахождение имущества и ознакомление:** Гродненская обл., г. Слоним, ул. Анищика, 90 в рабочие дни с 9.00 до 16.00

**Сведения о продавце:** Слонимское ГУП ЖКХ, г. Слоним, ул. Брестская, 103В, тел.: 8 (01562) 67038, 67003,67007

**Сведения об организаторе торгов и номер счета для перечисления задатка**: Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел. 8(0152) 621632, счет BY65BLBB30150500481906001002 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской обл., код BLBBBY2X , УНП 500481906

**Торги состоятся 10 октября 2022 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8**

**Срок подачи документов для участия в торгах:** **По 04 октября 2022 года включительно до 16.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8**

**Условия аукциона:** возмещение покупателем затрат предприятия на оценку транспортных средств в сумме 145,00 руб. по каждому лоту. Шаг аукциона 5 %. **Срок заключения договора купли-продажи:** не позднее 5 рабочих дней после утверждения протокола аукциона.
**Условия оплаты:** по соглашению сторон. Условия участия и порядок проведения аукциона по тел. 8 (0152) 621632 и на сайте www.fincentr.by.
*Предыдущие публикации: газета «Звязда» от 08.06.2022 г., 13.08.2022 г.*

# «ТРАВУ СКАСІЛІ ТРАКТАРЫ, А ТЫ БЯРЫ... ЦІ НЕ БЯРЫ...»



**Што было — было, прычым не вельмі і даўно: лёс з дзедам вясковым звёў, разгаварыліся — пра жыццё-быццё і здароўе, пра сям'ю, гаспадарку. Спыталі, у прыватнасці, ці трымае ж яшчэ кароўку? «Не, — адказаў. — А навошта яе трымаць? У поле выпусціў ды хай сабе ходзіць». — «Тады хаваеце?» — удакладнілі ў мужчыны. «А сэнсу — хаваць? Калі хто захоча ўкрасці — усё адно ўкрадзе... У хляве стаіць». — «Значыць, маеце?!» — «Ды што вы? — як не пакрыўдзіўся дзед. — У мяне ж жонка ёсць». Карацей, так і не даўмеліся тады, як жа трэ было спытаць пра кароўку? Можа, «з тылу зайсці»: пацікавіцца, ці накасіў ён сена? А можа...**

Найстарэйшая беларуская газета не адно дзесяцігоддзе задае сваім чытачам розныя задачкі: падбівае то нешта ўспомніць, то выйграць, то адказаць на пытанні, то прыдумаць подпіс да здымка, а то і... усё гэта разам, адначасова. Ну сапраўды: што на верхнім здымку — пытанне. Каб адказаць на яго, міжволі нешта прыпомніш, а мо і прыдумаеш. А калі пры гэтым яшчэ і пастараешся, дык нават выйграеш!

Прыклад патрэбен? Ды калі ласка! Хоць сто штук, як той казаў!

«Чарговы конкурсны здымак найперш нагадаў мне анекдот, — паведамляе **спадар Мікалай Старых з Гомеля**. — Сын фермера трапіў на службу ў войска. Піша адтуль: «Дарагія мама і тата! У мяне ўсё добра. Не паверыце, але тут кожны дзень аж да шасці гадзін раніцы можна спаць».

Дома, трэба разумець, хлопец не меў падобнага шчасця. Адкуль:

*Ад світання да змяркання*
*Завіхаўся фермер Саня.*
*І цяпер*
*на трэці воз*
*Грузіць свой другі ўкос...*
*З ім сабака ходзіць побач.*
*Ды якая з яго помач?*
*Не сабачая тут справа.*
*Для сабак —*
*трава не страва.*

Гэта праўда, прычым вядомая нават дзецям! А вось іх татам, на жаль, не заўжды. Многія з іх (паводле **спадара Мікалая Камароўскага з Оршы**), спачатку, што называецца, наступаюць на граблі і толькі потым, атрымаўшы імі па лбе, пачынаюць разумець:

*Быў дурным я,*
*што палена,*
*Бо сям'і (!)*
*шукаў замену:*
*Працаваў,*
*не знаў спачыну,*
*Не для дзетак,*
*а для псінаў...*
*Ці прабачыш тое, Лена?*
*Ці захочаш зноў на сена,*
*Як раней было...*
*Дык вось —*
*Я вязу дадому воз!*

І гэта, відаць, правільнае, абдуманае рашэнне, бо...

Выснова ад **сужэнцаў Астроўскіх з Мінска:**

*Накасіў Ясь канюшыны,*
*Ды бяда —*
*няма Яніны,*
*Каб вазок*
*як трэба скласці...*
*Няма жонкі —*
*няма шчасця.*

А вось чаму? Прычын, відавочна, шмат. **Спадарыня Любоў Чыгрынава з Мінска** ўбачыла хіба адну:

*Усёй Грушаўцы вядома —*
*Працаголік гэты Рома!*
*Гаспадар — на ўсю акругу:*
*І з касою, і за плугам!*
*Гумарыст, не выпівоха...*
*Чаму ж дзеўкі*
*бокам-бокам?*
*— З ім жа будзеш пеклаваць:*
*Ні паспаць, ні пагуляць...*

Што праўда, тое праўда (**ад сужэнцаў Астроўскіх**):

*Недзе вёска, недзе хатка,*
*Усё да толку,*
*усё ў парадку:*
*У хляве стаяць каровы,*
*Пад паветкай*
*сохнуць дровы,*
*Побач лес сцяной стаіць...*
*Тут бы добра адпачыць!*
*...Сорам —*
*нават заікацца,*
*Бо ўсюды —*
*праца, праца...*

Што крыўдна, з цягам часу яна мала мяняецца:

*Конік, воз*
*ды граблі-вілы —*
*Вось рыштунак селяніна.*
*Ад прагрэсу, новае —*
*Колы — ужо гумовыя.*

Прыкмеціла гэта **спадарыня Валянціна Гудачкова з Жыткавіч.**

Уважліва глядзеў на здымак і **спадар Мікалай Касмачэўскі з Наваполацка**. Што ўбачыў? Чытайце:

*На сабаку,*
*мужыка,*
*Яго воз, яго канька*
*Я без зайздрасці гляджу,*
*Бо ўсё трактарам важу.*
*Агрэгат набыў —*
*што трэба!*
*Маю хлеб*
*і ўсё да хлеба.*
*На жыццё*
*не наракаю,*
*Шчасце ў працы —*
*цвёрда знаю.*

А вось хто-ніхто, на думку **спадара Віктара Сабалеўскага з Узды,** сумняваецца, нават паспрачацца гатовы:

*Тры сыны ў Міколы ёсць,*
*Тры нявесткі, унукі...*
*За работу*
*ні адзін*
*Не зачэпіць рукі:*
*Ім бы ў садзе*
*паляжаць,*
*Шашлыкоў*
*насмажыць...*
*«Сам ідзі*
*на сенажаць», —*
*Так Міколу кажуць.*

Стары анекдот, але ж тут дарэчы. Тыя ці не тыя сыны ў вёску прыехалі, пасядзелі з бацькам, выпілі, закусілі-пагаварылі. «Ну а зараз, хлопцы, пойдзем сена касіць», — запрашае гаспадар. Госці ў адказ: «Вось умееш ты, бацька, свята сапсаваць! І няшмат жа выпіў, а такое глупства нясеш»...

Праўда, не заўсёды: згода паміж бацькам і дзецьмі таксама бывае. Помніце: «У панядзелак раніцой сена маладое касіў бацька, касіў я, мы касілі двое».

У аўторак — і гэтак жа дружна — яны сушылі, у сярэду — зносілі-зграбалі, у чацвер — вазілі, у пятніцу... прадавалі, у суботу — пілі-гулялі, а ў нядзелю ўжо плакалі ды гаравалі: думалі, чым жа карову зімой карміць?

Зрэшты, гэтак спявалася раней. Зараз, паводле **спадарыні Войцік з Гродна**, апошні куплет можна ўжо іначай, бо тое сена:

*...Касіў бацька, касіў я*
*Мы касілі разам,*
*А прыйшла адна каза —*
*З'ела ўсё адразу.*

Трэба разумець, старанныя былі касцы?

Не лепшыя «сустрэліся» і **спадару Сабалеўскаму:**

*У суботу грамадой —*
*Дзела маладое —*
*На касьбу ішлі з расой:*
*Сенажаць... Раздолле.*
*Адышліся на спачын —*
*Скралі сена тое...*
*Прапіў бацька,*
*прапіў сын.*
*Прапівалі двое.*

Анекдот. Пра іх, пра п'яніц, толькі гарадскіх. Адзін нейкім цудам да ўваходу ў метро «дапоўз». Далей ахова не пусціла. А мужчыну ж хочацца... «Скажы, — просіць ён ахоўніка, — а ўнутры там праўда лесвіца ёсць, на якую стаў і паехаў — нагамі хадзіць не трэба?» — «Ну ёсць, эскалатар называецца», — кажа ахоўнік. — «І што, столі там у люстрах, а сцены ў мармуры — не брахня?» — «Ды не». — «І электрычкі ходзяць — не **па** зямлі, а **пад** зямлёй, гэта што — **таксама** праўда?!» — веры не дае п'яны. «Ну, вядома ж! Ты што, з прыезджых?» — «Не, я мясцовы. Сорак гадоў тут жыву». — «І што — ні разу ў метро не быў?» — «Дык вы ж не пускаеце».

Усё лагічна... І жыццё, кажуць, як тая жанчына (ці мужчына): калі вып'еш — не такое ўжо і страшнае. Да таго ж у іх, у п'яніц, — свой рэцэпт шчасця: на стале напісаў «Заўтра кіну...», раніцай прачнуўся, прачытаў і рады: «Добра, што не сёння».

Бо сёння (**паводле спадара Сабалеўскага**)

*Канюшыну Ясь касіў —*
*Не было Яніны.*
*Покуль воз*
*адзін злажыў —*
*Забалела спіна.*
*Ледзь дамоў*
*прышкандыбаў*
*Мужыкам прызнаўся,*
*Што ў памочніцы б узяў*
*Нават бабу Стасю!*

Як казаў Жванецкі, хочаш усяго і адразу — атрымліваеш нічога і паступова.

З тога ж «канверта»:

*«Адзін робіць, сем —*
*ляжыць, —*
*Так раней казалі. —*
*Трэба жыць*
*як набяжыць...»*
*Вось і прычакалі:*
*На пяць вёсак*
*адзін конь,*
*Тры свінні, карова.*
*Мазалі на ўсю далонь —*
*Толькі ў Пятрова.*

Ды, можа, яшчэ ў Максіма, унука **спадарыні Таццяны Новікавай з Клеччыны**. «Тэма нарыхтоўкі сена, — піша яна, — мне вельмі блізкая, бо мой унук у свае восем гадоў ужо добра косіць вялікай дзедавай касой, і гэта яму так падабаецца!..

А вёска ў нас — абапал шашы: ад дарогі да падворкаў метраў 15. Раней там пасвіліся каровы, авечкі, козы, гусі — касіць не было чаго. Цяпер — ёсць, але трава амаль нікому не патрэбна: людзі абкошваюць хіба свае платы. Усё астатняе — так званая дарожная паласа... Дык вось сёлета ў чэрвені трава там была ледзь не ў пояс! Трактарысты-дарожнікі з дапамогай тэхнікі скасілі яе, за два-тры дні ўсё высахла. Атрымалася гатовае добрае сена. Нехта браў яго козам альбо трусам, аднак большасць пракосаў так і засталася ляжаць, урастаць у новую траву».

Адгэтуль, трэба разумець, і чарговая спроба «перапеву»:

*Не йшлі касцы.*
*І не звінелі косы,*
*Трава ж —*
*пападала ў пракосы:*
*Яе скасілі трактары,*
*А ты бяры...*
*Ці не бяры.*
*Іван падумаў:*
*грэх не ўзяць —*
*Дабру*
*навошта ж прападаць?*
*Да Клавы зараз завязе*
*На ўсю зіму*
*трусам, казе.*
*А Клава —*
*цётка не скупая —*
*Як разлічыцца,*
*добра знае.*

Трэба разумець, навучыла жыццё, пацвердзіла мудрасць старажытных грэкаў: «У няшчасцях мы набываем сілу, дзякуючы хваробам, зведваем цану здароўя, сутыкаючыся са злом, пачынаем цаніць дабро...» Калі ёсць яно. А то ж...

Да здымка — ад **спадарыні Соф'і Кусянковай з Рагачоўшчыны:**

*Жыць у прымах*
*трэба знаць —*
*Жонцы-цешчы слугаваць.*
*І работу ўсю вярнуць...*
*А паесці —*
*як дадуць...*
*Нават Бобіку шкада:*
*Не жыццё — адна нуда.*

Прымачае, кажуць, і сапраўды сабачае. Але ж, як вучаць мудрыя, «не чакайце, што стане прасцей і лягчэй. Не стане. Цяжкасці будуць заўсёды. Вучыцеся быць шчаслівымі проста зараз». (З нашага, жаночага: «Мне тут наваражылі такога... Прыгожага, разумнага, добрага, смелага, вернага... Напэўна, я сабаку заведу).

А пакуль да здымка ад **спадарыні Войцік:**

*Рэвізораў — што сабак:*
*«Воз кладзеш*
*зусім не так...»*

Ад **спадарыні Чыгрынавай:**

*Калі хочаш есці ўволю,*
*Укладай душу ў поле.*
*А працуеш без душы,*
*Дык і вырастуць шышы.*

І ўжо апошняе — ад **спадарыні Гудачковай:**

*Сена духмянае*
*сонейкам поўніцца.*
*Хопіць для коніка,*
*будзе кароўцы,*
*Ды й гаспадар*
*паляжаць не адмовіцца —*
*Дасць адпачыць*
*задуменнай галоўцы.*

Але ж гэта — потым, з часам, зімой. Зараз...

Не хочацца згадваць банальнае «восень работ восем», бо ў кожнага яны свае. Нам жа час закругляцца ды падводзіць вынікі. Такім чынам, найлепшыя радкі пра веласіпедыстаў, якія кіравалі ў вёску Пагулянка *(гл. нумар «Звязды» за 29 чэрвеня)*, паводле меркаванняў вялікага чытацкага журы, склалі **спадарыні Валянціна Гудачкова з Жыткавічаў і Соф'я Кусянкова з Рагачоўшчыны, спадары Мікалай Камароўскі з Оршы, Віктар Сабалеўскі з Узды, Іван Янкаў з Мінска** і **Валерый Гаўрыш з Чавусаў.** Іх дасціпныя радкі *«У дальняй вёсцы Пагулянка // Самагонку цісне Ганка // Першы слоік паўлітровы // Дэгустуе ўчастковы...»* і *«У мястэчку Пагулянка // Казіно адкрыў Іванка...»* набралі роўную колькасць чытацкіх галасоў, што азадачыла, нават напружыла сябраў журы маленькага — рэдакцыйнага. Павагаўшыся ды згадаўшы іншыя ўдалыя подпісы, яно ўрэшце аддало перавагу **спадару Валерыю Гаўрышу.**

Такім чынам, прыз у выглядзе падпіскі на дарагую сэрцам газету «Звязда» на чацвёрты квартал бягучага года накіроўваецца ў Чавусы.

Хочаце, каб да вас? Ды варыянтаў два: першы — не спазніцца аформіць падпіску, другі — уважліва паглядзець на чарговы конкурсны здымак, прыдумаць подпіс (можна некалькі, але трапных, дасціпных, кароткіх (не больш за восем радкоў) і даслаць у рэдакцыю. Шанц на выйгрыш мае кожны.

**Валянціна ДОЎНАР.**
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**

***АД ІХ ЖА** шчырыя прабачэнні ўсім, чые радкі гэтым разам не прайшлі строгага конкурснага адбору. Затое наступным...*

*Пішыце. У Дзмітрыя Мендзялеева ў школе была тройка па хіміі, Фёдара Шаляпіна не прынялі ў хор у Казані, а Джузэпэ Вердзі — у кансерваторыю, Стывен Спілберг з цяжкасцю скончыў школу і тройчы не паступіў ва ўніверсітэт, Альберт Энштэйн не размаўляў да чатырох гадоў і настаўнік прызнаў яго разумова адсталым...*

*Успамінайце пра гэта, калі падумаеце, што ў вас нічога не атрымаецца. Поспехаў!*



# ЛЯ КАРМЫ ПРАПЛЫВАЮЦЬ СТАГОДДЗІ







Гэта не маляўнічая метафара, а сапраўды так. Калі з аграгарадка Карма ўглядацца ў плынь ракі часу, то ў далечыні мінулых стагоддзяў можна разглядзець далёкі 1760 год, адметны тым, што мясцовыя майстры на сродкі вернікаў у той час пабудавалі тут невялікую драўляную Пакроўскую царкву.

Хіба ж маглі тады ўявіць тагачасныя дойліды, што праз стагоддзі наканавана ў гэтых мясцінах узняцца новаму велічнаму блакітнасценнаму храму ў выглядзе крыжа з пяціграннай апсідай, адзначанаму зззяннем залатых купалаў? Менавіта такім паўстае сёння гэты храм, сэрца Іаана-Кармянскага жаночага манастыра. А вакол яго (азірніцеся ў захапленні!) за стракатымі кветнікамі, за прыціхлай старой сцяной з брамаю такога ж нябеснага колеру віруе сучаснае жыццё. Дарэчы, усё сучаснае на гэтых вуліцах выгадна суседнічае з тым, што захавалася ад мінулага. Уздоўж манастырскай сцяны па асфальце катаюцца хлапчукі на скейтбордах, каля экскурсійнага аўтобуса конна праязджае вясковец, пад вокнамі драўлянай хаты з бліскучымі сучаснымі шклопакетамі, абрамленымі ўзорыстай шалёўкай красуецца новенькая легкавушка...

Не спыняецца рэчка часу, у гэтым зноў і зноў пераконваешся, калі глядзіш на яе з Кармы. Сядайце ў віртуальны човен, вяслуйце ў мінулае, разглядайце аддаленыя часам аблічвы славутых землякоў. Сярод іх (згодна з календаром мінулага стагоддзя) — Герой Сацыялістычнай Працы, народны пісьменнік Беларусі Іван Шамякін, Герой Савецкага Саюза, генерал-лейтэнант Аляксей Церашкоў, протаіерэй Іаан Гашкевіч, прылічаны да святых Беларускай праваслаўнай царквы...

Пра сёння жыхароў Кармы вам вычарпальна раскажа Аляксандр Пейган *(на здымку)*, які выконвае абавязкі старшыні мясцовага сельвыканкама. Насельніцтва аграгарадка невялікае, ледзь перавышае тысячу чалавек. Сярод мясцовых ёсць перасяленцы, якія пераехалі сюды з вёсак, забруджаных у выніку чарнобыльскай катастрофы. Людзі тут працавітыя, на ўсе рукі майстры. У гэтым пераконваешся, аглядаючы мясцовыя хаты: дагледжаныя, прыгожа расфарбаваныя, аздобленыя традыцыйнай драўлянай разьбой.

Зразумела, што сапраўднай рэчкі часу тут не ўбачыш, але вялікая сажалка па другі бок вуліцы ад манастыра таксама шмат аб чым раскажа. Кажуць, што бруяць тут у глыбіні крыніцы, і таму не перасыхае, не забруджваецца яе люстраная плынь.

**Яўген ПЯСЕЦКІ, фота аўтара.**

*Добрушскі раён.*







ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Автобаза» г. Заславль (продавец) проводит открытый аукцион по продаже**

## ИЗОЛИРОВАННОГО ПОМЕЩЕНИЯ № 2

***(составные части и принадлежности: открытая площадка с ограждением, железобетонный забор)*, инв. № 600/D-126190, общей площадью 868,6 кв. м, адрес: Минская область, Минский район, г. Заславль, ул. Советская, 122/5-2.**

Сведения о земельном участке: кадастровый номер 623650100001005386 *(право аренды по 30.09.2120)*, **площадь – 0,4685 га, адрес: Минский район, г. Заславль, ул. Советская, 122Д-2.**

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: расположен в водоохраной зоне реки Свислочь, и на природных территориях, подлежащих специальной охране (в зоне санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения артскважин №№ 304, 306-307, 309-324, 524-525 III пояс), пл. 0,4193 га, охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт, пл. 0,0014 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) **– 649 200,00** бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены **– 64 920,00** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB3012108260016 9330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, OTHR.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 3 (трех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона и и возмещает продавцу затраты на публикацию извещения о проведении аукциона.

